



















# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ БЕЛАРУСІ

# НАЦИОНАЛЬНЫЕ И ГОСУДАРСТВЕННЫЕ СИМВОЛЫ БЕЛАРУСИ



Леанід Спаткай

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ І ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ БЕЛАРУСІ

# НАЦИОНАЛЬНЫЕ И ГОСУДАРСТВЕННЫЕ СИМВОЛЫ БЕЛАРУСИ

2014

УДК 342.228(476)
ББК 67.400(Беи)
С71

Кніга друкуецца ў аўтарскай рэдакцыі

**Спаткай**, Леанід
С71 Нацыянальныя і дзяржаўныя сімвалы Беларусі = Национальные и государственные символы Беларуси / Л. У. Спаткай. – Мінск.: ?, 2008. – 64 с.: іл.
ISBN 978-985-0000-00-0.

У кнізе аналізуецца працэсс станаўлення дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь. Матэрыял прыводзіцца на беларускай і рускай мовах, суправаджаецца каляровымі ілюстрацыямі.

Кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў, у першую чаргу тым, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 342.228(476)**
**ББК 67.400(Беи)**

**ISBN 978-985-0000-00-0**

© Спаткай Л. У., 2014
© ?, 2014

Сцяг і герб з'яўляюцца важнымі сімваламі дзяржаўнага суверэнітэту – як толькі краіна дабіваецца незалежнасці, яна ўрачыста заяўляе пра свае сімвалы: герб і сцяг.

Сцягі лунаюць над дзяржаўнымі ўстановамі падчас афіцыйных мерапрыемстваў, а таксама на флагштоках караблёў. У большасці сваёй сцягі – гэта прамавугольныя палотнішчы, аднакаляровыя або састаўленыя з рознакаляровых палос. На некаторых сцягах маюцца геральдычныя выявы або надпісы.

Правобразамі сцягоў былі ваенныя знакі ў выглядзе шастоў з рознымі фігурамі на вяршынях, часта ўпрыгожаныя каляровымі стужкамі. Такія знакі выкарыстоўваліся са старажытных часоў, напрыклад, вядомы іх выявы на рэльефах Старажытнага Егіпта і Асірыі. У Старажытным Рыме да шастоў сталі мацаваць каляровыя палотнішчы. Рымляне называлі такія знакі словам «вексілумм». Менавіта гэта слова і стала асновай для назвы дапаможнай гістарычнай дысцыпліны – вексілалогіі, якая вывучае флагі і сцягі[1].

У старажытнасці больш распаўсюджанымі былі сцягі. Іх мелі вайсковыя падраздзяленні, рамесніцкія цэхі, гандлёвыя кампаніі, каралі і імператары, бо правілы класічнай геральдыкі дазвалялі любому ўладальніку герба мець і сцяг (гербавы штандар) аналагічнага малюнка.

Флагі ж раней выкарыстоўваліся ў асноўным на флоце, бо маракам было важна здалёк вызначыць прыналежнасць сустрэчнага карабля. Паступова флагі «перакачавалі» на сушу.

Найбольш важнымі і шануемымі з'яўляюцца дзяржаўныя і нацыянальныя флагі. Нацыянальны флаг – гэта сімвал нацыі, які ў мананацыянальных краінах часта выкарыстоўваецца ў якасці дзяржаўнага. Ва ўсіх краінах да сваіх нацыянальных і дзяржаўных флагаў адносяцца з вялікай павагай і пашанай, а за іх абразу можна атрымаць буйны штраф або іншае суровае пакаранне. У некаторых краінах у знак вялікай пашаны да флага просты чалавек можа вывешваць ля свайго дома толькі маленькі сцяжок або вымпел нацыянальных колераў і то толькі па вялікіх святах, напрыклад, у Дзень незалежнасці.

Многія флагі ўяўляюць сабой спалучэнне палос розных колераў, размешчаных вертыкальна або гарызантальна. Таму палосы на флагу прынята пералічваць зверху ўніз або ад дрэўка да вольнага бока. Напрыклад, расійскі флаг правільна называць «бела-блакітна-чырвоны».

Пры вертыкальным вывешванні палотнішча, якое складаецца з гарызантальных палос, яго верхняя паласа павінна размяшчацца злева ад гледача, а ніжняя – справа.

Правобразы гербаў – розныя сімвалічныя выявы, што змяшчаліся на вайсковым рыштунку, сцягах і асабістых рэчах, выкарыстоўваліся яшчэ ў старажытнасці. У творах Гамера, Вергілія, Плінія і іншых антычных аўтараў сустракаюцца ўпамінанні аб выкарыстанні такіх знакаў. І легендарныя, і рэальныя асобы мелі ўласныя эмблемы. Так, шлем Аляксандра Македонскага ўпрыгожваў марскі конь (гіпакамп), шлем Ахілеса – арол, шлем

[1] Уласна сцягі падраздзяляюцца на дзве вялікія групы, якія ў рускай мове маюць назвы «флаги» і «знамена». У беларускай мове ўсе яны называюцца «сцягі», што не зусім тоесна, таму, каб пазбегнуць блытаніны, слова «сцяг» далей будзе ўжывацца як тоеснае рускаму «знамя».

цара Нумідзіі Масінісы – сабака, шлем рымскага імператара Каракалы – арол. Шчыты таксама ўпрыгожваліся featureрознымі эмблемамі, напрыклад, выявай адсечанай галавы Гаргоны Медузы. Але гэтыя знакі выкарыстоўваліся як упрыгожанне, часта змяняліся ўладальнікамі, не перадаваліся ў спадчыну і не рэгламентаваліся ніякімі правіламі.

Большасць старажытных цывілізацый мелі ў сваёй культуры некаторыя элементы геральдыкі, напрыклад, сістэму пячатак. У Асірыі, Вавілоне і Старажытным Егіпце пячаткі выкарыстоўваліся, як і ў сярэдневяковай Еўропе, для пасведчання дакументаў. Некаторыя эмблемы астравоў і гарадоў антычнага свету выкарыстоўваліся на працягу стагоддзяў: на манетах, медалях і пячатках. Гэтыя рэчы захаваліся да нашага часу, дзякуючы чаму зараз вядома, што эмблемай Афін была сава, Карынфа – Пегас, Самоса – паўлін, вострава Радос – ружа. З 3-га тыс. да н. э. існаваў «герб» шумерскіх дзяржаў – арол са львінай галавой. Эмблемай Егіпецкага царства была змяя, Арменіі – каранаваны леў, Персіі – арол. У наступны перыяд гісторыі арол стаў гербам Рыма, а гербам Візантыйскай імперыі, якая хацела аб’яднаць пад сваёй уладай абедзве часткі былой Рымскай імперыі, стаў двухгаловы арол, які затым «пераляцеў» на гербы Албаніі, Расіі, Сербіі і некаторых іншых краін.

Такім чынам, розныя геральдычныя знакі і эмблемы існавалі ўсюды і заўжды, але ўласна гербы з’явіліся ў Еўропе толькі ў Х ст. Гэта былі гербы рыцараў, якія сталі затым радавымі, а некаторыя з іх – і дзяржаўнымі. Так, у аснове амаль усіх дзяржаўных гербаў еўрапейскіх краін былі радавыя гербы правячых дынастый. Напрыклад, на гербе Даніі – тры блакітных леапарды на залатым полі, усеяным чырвонымі сэрцамі. На гербе Швецыі львы падтрымліваюць шчыт, яны ж знаходзяцца ў другой і трэцяй частках шчыта самога герба. Леў і на гербе Фінляндыі. На гербах Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембурга таксама леў – старажытны герб герцагаў Бургундскіх. Льва можна ўбачыць і на гербах іншых краін. А на гербах Аўстрыі, Албаніі, Балівіі, Германіі, Інданезіі, Ірака, Калумбіі, Лівіі, Мексікі, Польшчы, Сірыі і многіх іншых краін прысутнічае другі старажытны сімвал дзяржаўнай улады – арол.

Сімвал дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі, яе Дзяржаўны герб, не мае ні выявы арла, ні выявы льва. Тым не менш яго гісторыя, як і гісторыя Дзяржаўнага флага Беларусі, пачынаецца ў глыбіні вякоў амаль адначасова з гісторыяй беларускага народа. Менавіта аб гэтым і апавядае наша кніга. Яна складаецца з дзвюх частак. Адна частка напісана на беларускай мове, другая – пераказ зместу першай часткі – напісана на рускай мове. Акрамя таго, у кнізе змешчаны малюнкі амаль усіх існаваўшых сімвалаў дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі.

Аўтар спадзяецца, што кніга будзе карысная не толькі тым, хто цікавіцца гісторыяй і геральдыкай, але і ўсім жыхарам нашай краіны, якія жывуць і працуюць для яе дабрабыту пад гэтымі сімваламі беларускага дзяржаўнага суверэнітэту.

# СІМВАЛЫ ДЗЯРЖАЎНАГА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# 1. ФЛАГ. ГІСТОРЫЯ СТАНАЎЛЕННЯ

## 1.1. Вытокі сімволікі беларускага флага

Яшчэ ў сярэднія вякі многія княствы і іншыя дзяржаўныя ўтварэнні Еўропы мелі свае дзяржаўныя сімвалы.

Як вядома, любы герб можна раскласці на колеры флага ці знайсці адпаведны яму вексілалагічны сімвал, таму і флагі дзяржаў або састаўлены з гарызантальных ці вертыкальных палос рознага колеру, або маюць які-небудзь просты сімвал на аднакаляровым палотнішчы. Так, гербам з выявамі хрысціянскіх святых адпавядалі флагі з крыжамі розных форм і колераў. Напрыклад, на белым палотнішчы нацыянальнага флага Англіі – чырвоны Георгіеўскі крыж, на блакітным палотнішчы нацыянальнага флага Грэцыі – белы Георгіеўскі крыж, на блакітным палотнішчы нацыянальнага флага Шатландыі – белы крыж Святога Андрэя Першазванага, на флагу Ваенна-Марскога Флоту Расіі на белым палотнішчы – сіні крыж Святога Андрэя Першазванага, а на флагу пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь – чырвоны крыж Святога Андрэя Першазванага на зяленым полі[1].

Таксама і старажытнаму беларускаму гербу «Пагоня», які з'яўляецца выявай Святога Георгія-Юрыя – нябеснага абаронцы Белай Русі і заступніка яе воінаў, адпавядаў белы флаг з чырвоным крыжам. Вытокі паходжання гэтых сімвалаў губляюцца ў глыбіні вякоў, а ў самой сімволіцы герба цесна перапляліся як старажытныя паганскія сімвалы крывічоў, так і хрысціянскія сімвалы. У паганскай сімволіцы чырвоны колер шчыта герба – колер Дажбога, колер баявых шчытоў нашых продкаў, якія лічылі сябе Дажбожымі ўнукамі; срэбны (белы) падвоены крыж у блакітным полі – відазменены грамавы знак Перуна, сімвал-абярэг воіна на полі бітвы ад рукі ворага; белы колер вершніка і каня – гэта сімвал святла, якое дае жыццё; сама выява вершніка – гэта выява Ярылы, які адчыняе вароты жыцця на зямлі; блакітны колер – сімвал Прамаці Сусвету.

У хрысціянстве блакітны колер сімвалізуе Бога – Духа Святога і Сафію Прамудрасці Божай; узброены вершнік – гэта Георгій-Юрый Перамаганосец, заступнік воіна і абаронца Белай Русі; белы колер сімвалізуе душу веруючага, а чырвоны – вогненную праўду слова Божага, якая пакінула свой след у гэтай душы (таму ў адзенні праваслаўных іерархаў прысутнічае белая стужка з чырвонай паласой пасярэдзіне).

Цікава, што чырвоны, белы і блакітны колеры ў розных спалучэннях вельмі папулярныя ў розных народаў. Так, напрыклад, гэтыя колеры маюць нацыянальныя флагі Расіі, Славакіі, Славеніі, Харватыі, Сербіі, Чарнагорыі і некаторых іншых дзяржаў. А вось нацыянальныя флагі Польшчы і Чэхіі – бела-чырвоныя. Дзяржаўныя флагі славянскіх краін мала чым адрозніваюцца ад нацыянальных: напрыклад, дзяржаўныя флагі Польшчы, Славакіі, Славеніі і Харватыі адрозніваюцца ад нацыянальных толькі наяўнасцю дзяржаўнага герба, а дзяржаўны флаг Чэхіі – блакітным трохвугольнікам ля

[1] Приказ Председателя Государственного комитета пограничных войск Республики Беларусь от 20.03.2000 г. № 98.

дрэўка, які застаўся на памяць аб адзінай дзяржаве са Славакіяй.

Пануючымі колерамі гербаў славянскіх краін таксама з'яўляюцца белы (срэбны) і чырвоны, што адпавядае правілам раскладання колераў герба на колеры флага. Так, герб Польшчы – срэбны арол у чырвоным полі, Чэхіі – срэбны леў у чырвоным полі, Славакіі – срэбны шасціканцовы крыж на блакітных пагорках у чырвоным полі, Славеніі – срэбная гара Трыглаў у блакітным полі, Сербіі – у чырвоным полі срэбны крыж і чатыры срэбныя крэсівы, Харватыі – чырвонасрэбная «шахоўніца».

Але на гербах некаторых славянскіх краін блакітны колер адсутнічае, хаця на флагах ён ёсць. Атрымалася так таму, што нацыянальныя гербы ўзніклі намнога раней, чым цяперашнія нацыянальныя флагі, блакітная паласа якіх робіць іх падобнымі на флаг Расіі. І гэта сапраўды так, бо гэта паласа з'явілася на нацыянальных флагах паўднёвых славян у знак удзячнасці Расіі за дапамогу ў іх барацьбе за незалежнасць.

Колеры расійскага флага таксама адпавядаюць колерам герба Вялікага княства Маскоўскага (цяпер – гэта герб Масквы): на срэбным кані вершнік у срэбнай брані, паверх якой блакітнае карзно, у чырвоным полі забівае дзідай цмока.

Дарэчы, калі нашы суседзі-літоўцы ў 1938 г. абмяркоўвалі пытанне, якімі павінны быць іх дзяржаўныя сімвалы, вядомы мастак, беларус па паходжанні, Мсціслаў Дабужынскі прапанаваў у якасці літоўскага дзяржаўнага флага зацвердзіць бела-чырвона-жоўты флаг, што адпавядала б колерам герба літоўскай дзяржавы: срэбны вершнік у чырвоным полі з чырвоным шчытом, на якім залаты крыж. Менавіта такі выгляд меў і прыняты праз больш чым паўстагоддзя Дзяржаўны герб Літвы[1], праўда, пасля звароту некалькіх членаў Усерасійскага геральдычнага таварыства да вышэйшай улады Літвы ў яго ўнеслі істотныя змены: шчыт стаў блакітным, блакітнымі ж сталі збруя і краі гунькі. Гэты від герба адпавядаў гістарычным гербам Полацкага княства і Полацкага ваяводства (за выключэннем колеру крыжа, залаты колер якога быў выбраны свядома, каб, згодна з правіламі геральдыкі, Дзяржаўны герб Літвы меў адрозненне ад полацкага герба).

Беларускі нацыянальны герб – старажытны герб Полацкага княства, а затым і герб Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага «Пагоня» – арганічна ўпісваецца ў гэты славянскі рад: на срэбным кані вершнік з занесеным мячом, у срэбным узбраенні, у чырвоным

[1] Дзяржаўны герб Літвы зацверджаны 10 красавіка 1990 г. Нягледзячы на тое, што гістарычным гербам Жамойціі быў чорны мядзведзь, сучасны герб Літвы быў створаны на аснове полацкага герба і першапачаткова меў чырвонае поле шчыта вершніка. Магчыма, гэта было зроблена пад уплывам сімволікі князя Міндоўга, якому пасля хрышчэння паводле каталіцкага абраду магістр Лівонскага ордэна ўручыў ад імя Папы Інакенція XIV сцяг з выявай срэбнага шасціканцовага крыжа ў чырвоным полі, затым гэта выява стала асабістым гербам Міндоўга. Такім чынам, белы шасціканцовы крыж у чырвоным полі мае зусім іншыя паходжанне і сэнс, чым белы падвойны крыж у блакітным полі, таму ў хуткім часе на гербе Літвы колер шчыта вершніка з чырвонага, што не адпавядала гістарычным колерам «Пагоні», быў зменены на блакітны, а крыж застаўся залатым, бо амаль да канца XVIII ст. шчыт вершніка «Пагоні» быў блакітны, а крыж – залаты. І нават назва сучаснага літоўскага герба «Вітіс» сведчыць пра яго беларускае паходжанне: у літоўскай мове няма слова для дакладнага перакладу беларускага слова «Пагоня», таму ў 1845 г. літоўскі гісторык С. Даўкантас прапанаваў літоўскую кальку беларускага слова «віцязь».

полі, трымае блакітны шчыт са срэбным падвоеным крыжам.

Ёсць звесткі, што падчас існавання Беларускай Народнай Рэспублікі яе ўрадам рабілася спроба прыняць Дзяржаўны флаг, які б адпавядаў колерам Дзяржаўнага герба. Ёсць фотаздымак Рады БНР у Вільні. На ім бачны герб «Пагоня», па баках якога два бела-чырвона-белыя флагі, на якіх паміж чырвонай і белымі паласамі бачны вузкія, прыкладна ў 1/4 шырыні асноўных палос, палоскі больш цёмнага, чым чырвоны, колеру. Наконт гэтых цёмных палосак беларускія вексілолагі Аляксандр Басаў і Іван Куркоў выказалі такое меркаванне: «На фатаграфіі таго часу бачна, што выкарыстоўваліся флагі БНР з вузкімі, відавочна чорнымі, палоскамі ўздоўж чырвонай паласы. Гэта Дзяржаўны флаг БНР... Што ж, эміграцыя... – гэта заўсёды трагедыя для тых, хто любіць Радзіму, і знак траура з'яўляецца такім натуральным у гэтай сітуацыі»[1]. Але, хутчэй за ўсе колер гэтых палосак – цёмна-блакітны, колеру шчыта вершніка герба. Тады колеры герба арганічна спалучаюцца з колерамі флага: на срэбным кані срэбны вершнік з паднятым мячом і блакітным шчытом скача ў чырвоным полі, на блакітным шчыце – срэбны падвоены крыж: белы, блакітны, чырвоны, блакітны, белы.

З гістарычных крыніц вядома, што былі спробы змясціць блакітны колер на бела-чырвона-белы флаг, што рабіла б яго падобным на флагі іншых славянскіх народаў. Напрыклад, у 1917 г. на I Усебеларускім з'ездзе ў якасці Дзяржаўнага флага Беларусі быў прапанаваны праект чырвона-бела-блакітнага флага, як зараз Дзяржаўны флаг Харватыі, але чамусьці гэты праект не быў зацверджаны.

Менавіта зыходзячы з таго, што нацыянальнымі колерамі, колерамі нацыянальных герба і флага, павінны быць белы, чырвоны і блакітны, і быў распрацаваны праект флага Беларускага згуртавання вайскоўцаў, ваеннаслужачых запасу, асоб у адстаўцы і іншых грамадзян, якое больш вядома як БЗВ. Флаг уяўляе сабой бела-чырвона-белае палотнішча, ля дрэўка яго размешчаны блакітны роўнабаковы трохвугольнік (даўжыня яго бакоў роўна шырыні флага), у якім белы падвоены крыж[2].

Такім чынам, агульнымі колерамі нацыянальных сімвалаў большасці славянскіх народаў з'яўляюцца белы і чырвоны. Вытокі сімволікі бела-чырвоных колераў – у 2-м тыс. да н. э. У гэты час індаеўрапейскія плямёны, сярод патомкаў якіх і беларускі народ, займалі вялікія тэрыторыі Еўразіі. У большасці гэтых плямёнаў шанаваліся белы і чырвоны колеры. Белы колер – колер мацярынскага малака, якое дае жыццё, – асацыіраваўся з карміцелькай-зямлёй, з маці-прыродай. Чырвоны – колер агню і крыві – сімвалізаваў вечнае жыццё. Таму белы і чырвоны колеры былі дамінуючымі і ў паўсядзённым жыцці (напрыклад, белае адзенне з чырвонай вышыўкай), і ў рытуалах (напрыклад, пры раскопках пахаванняў таго перыяду археолагі знаходзяць, памерлых, шчодра пасыпаных чырвонай фарбай – охрай). Пазней чырвоны колер стаў колерам галоўнага бога ўсходніх славян, бога Святла – Дажбога, або Купалы.

---

[1] *Басаў А. Н., Куркоў І. М.* Сцягі Беларусі ўчора і сёння. Мінск: Полымя, 1994. С. 20.

[2] Флаг зацверджаны рашэннем Каардынацыйнай Рады Патрыятычнага Руху ад 13 красавіка 1997 г., пратакол № 5.



Нацыянальны флаг Англіі



Нацыянальны флаг Шатландыі



Нацыянальны флаг Грэцыі



Ваенна-Марскі флаг Расіі



Нацыянальны флаг Расіі



Флаг групы рачных катэраў
пагранвойск Рэспублікі Беларусь



Нацыянальны флаг Польшчы



Дзяржаўны флаг Чэхіі



Рэканструкцыя А.Басава і І.Куркова
флага Рады БНР у Вільні (1919–1925)



Нацыянальны флаг беларусаў
і Дзяржаўны флаг БНР (05.08.1918)



Рэканструкцыя Л.Спаткая флага
Рады БНР у Вільні (1919–1925)



Варыянт першага Дзяржаўнага флага
Беларусі (25.03.1917)



Праект флага, прапанаваны
на І Усебеларускім з'ездзе (1917)



Флаг Беларускага згуртавання
вайскоўцаў



Дзяржаўны флаг Харватыі



Флаг Беларускага аб'яднання
татар-мусульман «Аль-Кітаб»

Славянская сімволіка колеру аказала рашучы ўплыў на сімволіку Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага ў XIII ст. і дзе славянскі генезіс быў пануючым: землі, на якіх жылі славяне, складалі 9/10 тэрыторыі гэтай дзяржавы.

Прыкладна з XV ст. ў Вялікім княстве ў адпаведнасці з правіламі заходнееўрапейскай геральдыкі, якая вызначала парадак раскладання герба на колеры флага, сталі з'яўляцца двухкаляровыя флагі. Выява трохпалоснага бела-чырвона-белага флага ёсць на адной з гравюр «Хронікі ўсяго свету» польскага гісторыка М. Бельскага, створанай у 1551 г. Відавочна, што гэты флаг з'явіўся пазней польскага бела-чырвонага флага, бо колеры поля і фігур герба Вялікага княства і Каралеўства Польскага былі аднолькавымі, таму і пры раскладанні іх на колеры флага двухпалосным стаў той, які з'явіўся першым.

Але ёсць і іншыя звесткі пра паходжанне бела-чырвона-белага флага.

Бацька вядомага актывіста Беларускага згуртавання татар-мусульман «Аль-Кітаб» Я. Якубоўскага, А. Якубоўскі ўспамінаў, што, калі ён праходзіў у 30-я гг. XX ст. службу ў польскім войску, то пачуў наступны расказ. Быццам, у свой час, вядомыя прадстаўнікі беларускага нацыянальнага Адраджэння браты Луцкевічы знайшлі ў адным Аль-Кітабе (а сярод продкаў братоў былі татары, і ў Івана Луцкевіча старажытны Аль-Кітаб меўся у асабістай бібліятэцы) звесткі, што частка татар, якія ўдзельнічалі ў Грунвальдскай бітве 1410 г., змагаліся пад непасрэдным камандваннем Вітаўта ў складзе харугвы, што мела бела-чырвона-белы сцяг, на чырвонай паласе якога былі нашыты белыя маладзік і зорка (такі флаг у 1990 г. стаў афіцыйным сімвалам Беларускага аб'яднання татар-мусульман «Аль-Кітаб»). Лічачы, што бела-чырвона-белы сцяг быў асабістым сцягам папулярнага ў Беларусі вялікага князя Вітаўта, браты сталі прапагандаваць бела-чырвона-белы флаг як гістарычны флаг беларусаў.

На жаль, так і не ўдалася знайсці той Аль-Кітаб, які б пацвердзіў гіпотэзу братоў Луцкевічаў, але з іх легкай рукі бела-чырвона-белы флаг атрымаў распаўсюджанне ў розных колах нацыянальнага руху, з'явілася нават і легенда аб узнікненні бела-чырвона-белага флага. Яна апавядае, што аднойчы, ў жорсткай бітве з рыцарамі-крыжакамі, быў смяротна паранены князь, які ўзначальваў дружыну, – варожы меч рассек яму галаву. Воіны вынеслі князя з бою і перавязалі яго параненую галаву стужкай белага палатна. Але дружына, што засталася без свайго князя, не вытрымала націску ворага і пачала адступаць. Тады паранены князь сабраў усе свае сілы, падняўся, сарваў з галавы павязку, разгарнуў яе як сцяг і пайшоў у пекла бітвы. Убачыўшы гэта, беларускія воіны атакавалі ворага і разбілі яго ўшчэнт. А белае палотнішча з чырвонай паласой пасярэдзіне стала сімвалам мужнасці і адвагі.

Пасля Люблінскай уніі 1569 г., якая аб'яднала абедзве дзяржавы ў Рэч Паспалітую, прадпрымаліся спробы зрабіць флаг гэтай дзяржавы шляхам камбінацыі флагаў Вялікага княства і Каралеўства. Так, Уладзіслаў IV выкарыстоўваў чырвона-бела-чырвоны дзяржаўны флаг, што цалкам адпавядала колерам гербаў Каралеўства і Вялікага княства, спалучэнне якіх складала дзяржаўны герб Рэчы Паспалітай. На палатне, дзе паказаны шлюбны ўезд Жыгімонта III Вазы і каралевы Канстанцыі ў Кракаў у 1605 г., ёсць выява флага, які кароль Жыгімонт выкарыстоўваў у якасці дзяржаўнага. Яго

складалі тры роўныя па шырыні гарызантальныя паласы: чырвоная, белая і чырвоная; у цэнтры палатна быў дзяржаўны герб Рэчы Паспалітай. У 1609–1616 гг. у якасці дзяржаўнага выкарыстоўваўся падобны, але чатырохпалосны флаг: бела-чырвона-бела-чырвоны. Зараз ён знаходзіцца ў каралеўскім музеі Стакгольма. На рубяжы XVII–XVIII стст. былі спробы зацвердзіць у якасці дзяржаўнага нават чырвона-белы флаг.

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай практычна ўся тэрыторыя цяперашняй Беларусі апынулася ў складзе Расійскай імперыі. У гэты перыяд было забаронена нават ужыванне назвы «Беларусь», не кажучы ўжо аб магчымасці выкарыстання нацыянальнага флага, хаця элементы нацыянальнай сімволікі выкарыстоўваліся некаторы час, да паўстання 1863 г., у сімволіцы вайсковых часцей расійскай арміі, якія былі сфарміраваны з ураджэнцаў Беларусі.

## 1.2. Паходжанне дзяржаўнага флага

Магчыма, што пытанне аб тым, якім быць беларускаму дзяржаўнаму флагу, паўставала ў час з’езда беларускіх нацыянальных арганізацый, што праходзіў у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. Шкада, што ніякіх дакументаў не захавалася, але ёсць успаміны ўдзельнікаў тых падзей, праўда, запісаныя праз некалькі год. Так, адзін з дзеячаў беларускага нацыянальнага руху К. Дуж-Душэўскі ў сваіх мемуарах, напісаных у 1930-я гг., успамінае, што калі паўстала пытанне аб тым, якім быць дзяржаўнаму флагу, ён зрабіў некалькі яго праектных эскізаў, з якіх быў ухвалены праект бела-чырвона-белага флага. Дакладная дата гэтай падзеі, на жаль, не названа. Але магчыма, што К. Дуж-Душэўскі зрабіў малюнак ужо існаваўшага раней бела-чырвона-белага флага. На карысць таго, што бела-чырвона-белы флаг існаваў да пачатку з’езда, гавораць наступныя факты:

1) у 1863 г. на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай успыхнула паўстанне. Першапачаткова паўстанцы выступалі пад польскім бела-чырвоным флагам, але маюцца ўскосныя сведчанні, што К. Каліноўскі выкарыстоўваў і бела-чырвона-белы флаг. Так, у 1870 г. студэнцкае брацтва младалатышоў, абмяркоўваючы, якім быць нацыянальнаму флагу, разглядалі і праект бела-чырвона-белага флага, але магчыма, што сярод іх аказаўся ўдзельнік або сведка паўстання К. Каліноўскага, таму праект бела-чырвона-белага флага быў адхілены, бо «ў такой камбінацыі ён супадаў з флагам беларусаў»;
2) маюцца таксама звесткі, што бела-чырвона-белы флаг выкарыстоўвалі ў канцы XIX ст. пецярбургскія студэнты-ліцвіны (беларусы) пры правядзенні культурна-асветніцкіх вечарын. Аб удзеле ў адной з іх успамінаў Я. Купала;
3) у 1916 г. у Пецярбургу Беларускі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны вывешваў на сваім будынку бела-чырвона-белы флаг;
4) падчас Дня беларускага «значка», які праходзіў ў Мінску 12 сакавіка 1917 г., распаўсюджваліся бела-чырвана-белыя значкі.



Харугва Рэчы Паспалітай XVI ст.




Пячатка і подпіс Аўгуста III



Герб Рэчы Паспалітай



Падчас бітвы войска арыентавалася на сцяг і кіравалася сігналамі вайсковых музыкаў. З гравюры XVI ст.



Персцень полацкага князя Усяслава Чарадзея. XII ст.



Пячатка Вітаўта. XIV ст.



«Трызуб» на манетах Яраслава Мудрага. 1012–1054 гг.



Пячатка князя Сямёна Альгердавіча. 1388–1389 гг.



Пячатка вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча. 1398 г.



Герб Льва Сапегі (са Статута Вялікага княства Літоўскага. 1588 г.)



Пячаткі князёў Вітаўта, Карыбута і Лугвеня. 1385 г.



Кафля з гербам трокскага ваяводы Я. Глябовіча. Кон. XVI ст., Заслаўе



Герб Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага (XVII ст.)

А вось ва ўспамінах іншых дзеячаў нацыянальнага руху ёсць звесткі, што пры адкрыцці з'езда 25 сакавіка быў вывешаны белы флаг, які павінен быў сімвалізаваць Белую Русь, але гэты флаг выклікаў дружныя пярэчанні дэпутатаў, бо белы флаг зарэкамендаваў сябе як флаг капітуляцыі. Тады на пасяджэнні толькі што створанага Беларускага Нацыянальнага Камітэта было разгледжана пытанне аб сімволіцы і быў зацверджаны прапанаваны Дуж-Душэўскім праект. Тады было прынята і рашэнне аб вырабе флагаў і забяспячэнні імі ўсіх мясцовых арганізацый.

Па ўспамінах Р. Астроўскага, менавіта такі бела-чырвона-белы флаг, на палотнішчы якога залатымі літарамі было вышыта «Няхай жыве вольная Беларусь!», ён асабіста атрымаў у маі 1917 г. у Слуцку, дзе тады працаваў. У газетах, якія выдаваліся ў той час, таксама ёсць звесткі аб існаванні бела-чырвона-белага флага, прычым у некалькіх варыянтах: флаг без надпісаў або выяў; флаг з нашытымі або вышытымі дэвізамі; флаг, на адным баку якога выява «Пагоні» ў промнях узыходзячага сонца. Сімволіка колераў флага тлумачылася так: белы колер сімвалізуе назву краіны і напамінае аб тым, што Беларусь была вольнай, незалежнай дзяржавай, калі астатнія ўсходнеславянскія землі знаходзіліся пад татара-мангольскім прыгнётам; чырвоны сімвалізуе нацыянальную рэвалюцыю і ўзыходзячае сонца як сімвал нацыянальнага адраджэння і вызвалення.

Гэты флаг атрымаў народнае прызнанне. Так, у Статуце беларускіх нацыянальных культурна-асветніцкіх гурткоў у войску, які быў прыняты 5 жніўня 1917 г. на Першай сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый, было запісана: «Кожны член беларускай грамады ў войску павінен насіць беларускі нацыянальны знак – белая стужка з чырвонай палоскай пасярэдзіне; усе тры палоскі – белая, чырвоная і белая – аднолькавай шырыні»[1]. Хаця ў час бальшавіцкай улады бела-чырвона-белы флаг быў забаронены, ён не быў забыты. Па некаторых звестках, флаг быў вывешаны на будынку, дзе раней размяшчаўся Народны Сакратарыят, яшчэ 19 лютага 1918 г., як толькі бальшавікі эвакуіраваліся з Мінска, але ён быў сарваны немцамі, якія хутка ўступілі ў горад.

Пасля абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і яе незалежнасці ад Расіі бела-чырвона-белы флаг і герб «Пагоня» сталі выкарыстоўвацца ў якасці дзяржаўных сімвалаў маладой рэспублікі. Нарматыўна флаг быў зацверджаны Сакратарыятам БНР 5 жніўня 1918 г., аб чым 11 жніўня паведаміла газета «Вольная Беларусь».

1 студзеня 1919 г., у процівагу БНР, бальшавікі аб'явілі аб стварэнні на частцы ўсходніх беларускіх земляў Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. 3 лютага таго ж года Першы з'езд Саветаў ССРБ прыняў Канстытуцыю Рэспублікі, у трэцім раздзеле якой прыводзілася апісанне флага ССРБ: «Артыкул 32. Гандлёвы і ваенны флаг ССРБ складаецца з палотнішча чырвонага (алага) колеру, у левым куце якога – ля дрэўка, наверсе змешчаны залатыя літары "С.С.Р.Б.", ці надпіс "Социялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусіі"»[2]. Гэты флаг з'яўляўся копіяй флагаў РСФСР і

---

[1] *Турук Ф.* Беларускі рух. Мінск, 1921. С. 91.

[2] История Советской Конституции 1917–1956 гг. М., 1957. С. 190.

Украінскай ССР, паміж сабой жа флагі адрозніваліся толькі змешчанымі на іх назвамі рэспублік, ды на флагу ССРБ палоскі, якія аддзялялі прамым вуглом першую чвэрць, або інакш верхні левы кут, з надпісам ад астатняга поля флага, былі белага колеру.

На аснове рашэнняў з'ездаў Саветаў Беларусі ад 4 лютага 1919 г. і Літвы ад 15 лютага 1919 г. на аб'яднаным пасяджэнні Цэнтральных Выканаўчых Камітэтаў Літвы і Беларусі, якое прайшло ў Вільні 27 лютага 1919 г., было прынята рашэнне аб аб'яднанні савецкіх рэспублік Беларусі і Літвы ў адзіную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі – ССРЛіБ, або ЛітБел. Тады ж быў распрацаваны і праект Канстытуцыі, які ўтрымліваў апісанне праектаў дзяржаўных сімвалаў ССРЛіБ. Дзяржаўным флагам ССРЛіБ павінна было стаць чырвонае палотнішча без надпісаў і малюнкаў.

ЛітБел праіснавала нядоўга. Ужо ў сакавіку 1919 г. пачалося нямецкае наступленне на тэрыторыю Літвы. Да 25 жніўня 1919 г. на ўсёй тэрыторыі Літвы савецкая ўлада была ліквідавана і ўтворана буржуазная рэспубліка. Фактычна ЛітБел скончылася 6 чэрвеня 1920 г., а 31 ліпеня 1920 г. была прынята «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусіі». У гэтай Дэкларацыі абвяшчалася аб аднаўленні ССРБ на пачатках, устаноўленых 1 студзеня 1919 г.[1] Флагам адноўленай рэспублікі стаў флаг ССРБ ад 3 лютага 1919 г., але толькі адзін варыянт, дзе была абрэвіятура «С.С.Р.Б.».

У лютым 1924 г. у БССР пачалася распрацоўка праекта новага герба рэспублікі, а ў хуткім часе – і праекта новага флага. Газета «Советская Белоруссия» ў нумары ад 11 чэрвеня 1924 г. паведаміла аб тым, што Інбелкульту даручана распрацаваць эмблему для Дзяржаўнага флага БССР. 10 снежня 1924 г. СНК БССР на сваім пасяджэнні разгледзеў пытанне аб эмблеме для флага БССР і пастанавіў прыняць прапанаваны праект, толькі замест галінкі сасны было вырашана змясціць галінку дуба. Але апісанне гэтай эмблемы нідзе не было надрукавана, бо было вырашана даведацца, якія флагі маюць УССР і рэспублікі Закаўказскай федэрацыі.

У 1925 г. у сувязі са зменай у 1922 г. назвы рэспублікі на «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка» быў зменены і парадак літар на флагу: «БССР».

Нягледзячы на рашэнне СНК БССР аб зацвярджэнні эмблемы, праца над праектамі новых дзяржаўных сімвалаў у Інбелкульце працягвалася, таму да 1 сакавіка 1926 г. Інбелкульту было прапанавана закончыць дапрацоўку праекта флага і прадставіць яго на разгляд Прэзідыума ЦВК БССР. Далейшы лес гэтага праекта невядомы.

Пасля ўтварэння 30 снежня 1922 г. СССР у Беларусі стала праводзіцца палітыка развіцця нацыянальнай культуры. Напрыклад, на беларускай мове вялося справаводства, выкладанне ў ВНУ, яна вывучалася ў вайсковых часцях, нават былі выдадзены на беларускай мове вайсковыя статуты і распрацаваны слоўнік каманднай лексікі. Таму ў 1926 г. была зроблена спроба прыняць беларускі нацыянальны флаг у якасці дзяржаўнага флага рэспублікі. З гэтай прапановай выступіў старшыня ЦВК БССР Я. А. Адамовіч.

[1] История Советской Конституции 1917–1956 гг. С. 236.




Шыльда вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Латвіі і Эстоніі




Паштоўка з Дзяржаўным гербам і гербамі беларускіх ваяводстваў



Пашпарт грамадзяніна БНР (вокладка)







Флагі ССРБ (3.02.–27.02.1919)




Флаг ССРБ (31.07.1920–1925)



Флаг ЛітБел (27.02.1919–6.06.1920)



Паштоўка БНР







Варыянты флага БССР
(1925–19.02.1937)




Флаг БССР (19.02.1937–25.12.1951)



Флаг БССР (25.12.1951–19.09.1991)



Дзяржаўны флаг Рэспублікі Беларусь
(19.09.1991–7.06.1995)



Адзін з праектаў флага, які планавала-ся вынесці на рэферэндум (май, 1995 г.)



Дзяржаўны флаг Рэспублікі Беларусь (з 7.06.1995)

Аднак неўзабаве ён быў рэпрэсіраваны, і больш ніхто не адважыўся зрабіць спробы адзрадзіць нацыянальны флаг.

Новы флаг 19 лютага 1937 г. зацвердзіў надзвычайны XII Усебеларускі з'езд Саветаў БССР. На чырвоным палотнішчы флага ў левым верхнім куце ля дрэўка размяшчаліся залатыя серп і молат, над імі – чырвоная пяціканцовая зорка з залатым кантам, пад сярпом і молатам – залатыя літары «БССР». Прапорцыі флага – 1 : 2.

У БССР бела-чырвона-белы флаг і «Пагоня» былі забаронены, а ў Заходняй Беларусі, якая адыйшла па Рыжскім мірным дагаворы 1921 г. да Польшчы, нацыянальныя беларускія сімвалы працягвалі выкарыстоўвацца беларускім насельніцтвам. Так, кукарды вучняў Віленскай гімназіі мелі бела-чырвона-белыя палосы, нацыянальныя сімвалы размяшчаліся ў беларускіх чытальнях і клубах, нават Чырвоную Армію 17 верасня 1939 г. сустракалі не толькі з чырвонымі флагамі, а і з бела-чырвона-белымі.

У час Вялікай Айчыннай вайны нямецкія акупацыйныя ўлады з мэтай прыцягнення на свой бок беларусаў, пацярпелых ад бальшавіцкіх рэпрэсій, дазволілі абмежаванае выкарыстанне беларускай нацыянальнай сімволікі. Аб гэтым сведчыць публікацыя 6 верасня 1942 г. у беларускай газеце «Раніца» (выдавалася ў Берліне), у якой сказана, што 27 ліпеня 1942 г. генеральны камісар В. Кубэ аддаў спецыяльнае распараджэнне, якім дазволіў пры правядзенні ўрачыстасцей выкарыстоўваць бела-чырвона-белы флаг і «Пагоню». Дазвол на выкарыстанне нацыянальных сімвалаў мог бы азначаць прызнанне права беларусаў на ўтварэнне ўласнай аўтаномнай дзяржавы ў складзе Германіі, але кіраўніцтва рэйха мела ў дачыненні да Беларусі зусім іншыя намеры, далёкія ад думкі аб яе аўтаноміі.

У 1951 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР абвясціў конкурс на новы флаг рэспублікі. Як праходзіў конкурс і як падводзіліся вынікі – невядома, бо не захавалася ніякіх дакументаў аб гэтым. Але 25 снежня 1951 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР дзяржаўным флагам рэспублікі быў зацверджаны праект, аўтарам якога з'яўляецца мастак Мікалай Іванавіч Гусеў: «Дзяржаўны флаг Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ўяўляе сабой палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных каляровых палос: верхняй чырвонага колеру, складаючай дзве трэці шырыні, і ніжняй зялёнага колеру, складаючай адну трэць шырыні флага, з выявай у верхнім левым куце чырвонай паласы залатых сярпа і молата і над імі чырвонай пяціканцовай зоркі з залатой каймой, ля дрэўка размешчаны беларускі нацыянальны арнамент белага колеру на чырвоным полі, складаючым 1/9 даўжыні флага. Адносіны шырыні флага да яго даўжыні 1:2». Зялёная паласа флага сімвалізавала лясы і сельскагаспадарчую вытворчасць рэспублікі, а арнамент сімвалізаваў самабытную культуру беларускага народа.

# 2. ГЕРБ. СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ

## 2.1. Фарміраванне сімволікі герба

Першыя гербы, як гербы ў поўным сэнсе гэтага слова, з'явіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі прыкладна ў XIV ст. Яны, у адрозненне ад рыцарскіх заходнееўрапейскіх гербаў, мелі іншае паходжанне. З незапамятных часоў нашы продкі, славяне-крывічы, карысталіся рознымі сімвалічнымі знакамі, якія служылі ім не толькі знакамі маёмаснай прыналежнасці, але і знакамі-абярэгамі, якія павінны былі дапамагаць іх уладальнікам у паўсядзённым жыцці або абараніць іх падчас вайсковай справы. Выявы гэтых сімвалаў змяшчаліся як на прадметах бытавога ўжытку (упрыгожанні, жыллё, адзенне і г. д.), так і на прадметах вайсковага рыштунку (зброя, сцягі і г. д.).

Традыцыі гэтыя зарадзіліся яшчэ ў паганскія часы, а хрысціянства, якое прыйшло на беларускія землі, прынесла свае асаблівасці: так, напрыклад, у якасці абарончых сімвалаў-абярэгаў воіны сталі выкарыстоўваць выявы анёлаў або святых[1], якіх лічылі сваімі нябеснымі заступнікамі. Вядома вялікая колькасць разнастайных геральдычных знакаў, якія таксама выкарыстоўваліся ў якасці вайсковых сімвалаў-абярэгаў. У шматлікіх летапісах, на фрэсках і барэльефах сабораў і цэркваў, на іконах, у археалагічных крыніцах знаходзім звесткі аб гэтых знаках. Часцей за ўсё гэта геаметрычныя фігуры: прамыя або косыя («андрэеўскія») крыжы, зоркі з чатырма, шасцю або васьмю канцамі-промнямі, радзей – рэальныя або міфічныя істоты.

Першыя гербы князёў беларускіх зямель таксама мелі просты выгляд. Часцей за ўсё гэта былі спалучэнні розных ліній, часта выкарыстоўваліся эмблемы, асновай якіх з'яўлялася выява стралы, мяча або крыжа, падковы або маладзіка. Так, гербам вялікага князя Альгерда (1345–1377) была выява крыжа з джаламі стрэл уверсе і ўнізе; гербам Скіргайлы – выява андрэеўскага крыжа; гербам Ягайлы (1377–1392) – шасціканцовы крыж, у якім ніжняя перакладзіна была амаль удвая даўжэй за верхнюю. Гербам Вітаўта стала відазмененая эмблема кіеўскіх князёў – «Трызуб», які атрымаў назвы «Слупы Гедымінавічаў», або «Калоны»: два вялікія вертыкальныя слупы, пасярод іх малы слуп на чатырохвугольніку, унізе слупы злучаны між сабой гарызантальным бруском. Сам жа «Трызуб» з'яўляецца стылізаванай выявай пікіруючага ўніз сокала – радавога знака-татэма даіндаеўрапейскага часу. Ён адпавядае старадаўняму ўяўленню аб сонцы як аб сокалу, што захавалася да нашага часу ў загадцы-прымаўцы: «Прыйшоў воўк – народ змоўк, узляцеў ясны сакол – народ вясёл», дзе «воўк» – цёмная ноч, «ясны сакол» – сонца. Сокалападобным быў і старажытнаславянскі бог агню і свету Рарог, і ў некаторых славянскіх мовах гэта слова захавалася да нашага часу, напрыклад польскае «rarog» і чэшскае «raroh» у перакладзе – сокал. Стылізаваная выява пікіруючага сокала была радавым знакам і летапіснага князя Рурыка, або Рарога.

Гэтыя і іншыя радавыя гербы змяшчаліся на пячатках, грошах, вопратцы, надмагільных плітах, будынках і г. д. Прычым самымі характэрнымі колерамі

---

[1] Лакиер А.Б. Русская геральдика. М., 1990. С. 69–70, 72.





Выява «Пагоні» на княжацкай пячатцы Аляксандра Неўскага. Гэты старажытны крывіцкі герб ён атрымаў у якасці своеасаблівага пасагу ад жонкі – полацкай князёўны Аляксандры

Пячатка князя Карыбута з дынастыі Гедымінавічаў. Канец XIV ст.



Выявы вершнікаў з пячатак літоўскіх князёў


Статутъ великого князства литовского
Ѡт наяснѣйшого г(оспо)д(а)ря короля его м(и)л(о)сти Жикгимонта третего на коронацыи въ Кракове выданы року ҂аф пи.
въ друкарни дому Мамоничовъ.
З ласки и привильемъ короля его м(и)л(о)сти.

Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588 г. Выданне Віленскай друкарні Мамонічаў



Герб Вялікага княства Літоўскага «Пагоня». З «Гербоўніка» 1578 г.



Адзін з бакоў полацкай каменнай пліткі для кляймення тавараў з выявай герба «Пагоня»



Статут 1588 г., падрыхтоўкай якога кіраваў Леў Сапега. Віленская друкарня Мамонічаў

гэтых ранніх гербаў былі белы і чырвоны: або белая (срэбная) фігура змяшчалася ў чырвоным полі шчыта, або наадварот – чырвоная ў срэбным полі. Гэтыя колеры шырока выкарыстоўваліся ў сімволіцы славян здаўна: яшчэ аўтар «Слова аб палку Ігаравым» упамінае белыя харугвы і чырвоныя шчыты славянскіх вояў[1].

Прагеральдычныя знакі нашых продкаў, як і ўзгаданы «Трызуб», у большасці сваёй адпавядалі або мелі сувязь з паганскімі божаствамі. Так, галоўным божаствам нашых продкаў быў бог Святла і Сонца Дажбог, ці Купала[2]. Яго колер – чырвоны, а сімвал яго – васьміпрамянёвая зорка-кветка[3]. Гэты сімвал і зараз добра вядомы і папулярны сярод нашага народа: ён сустракаецца ў вышываных і тканых нацыянальных узорах і арнаментах, у архітэктурным дэкоры пабудоў і яшчэ шмат дзе.

Гэты сімвал атрымаў шырокае распаўсюджанне і пашану сярод беларусаў не выпадкова: згодна са старадаўнімі легендамі, народ наш вядзе свой радавод ад самога Дажджбога-Купалы, таму аўтар «Слова аб палку Ігаравым» называе нашых продкаў Дажбожымі ўнукамі[4].

Даволі часта на прадметах вайсковага ўжытку сустракаецца эмблема бога вайны, грому і маланкі – Перуна[5]: шасціпрамянёвая зорка[6] або кола з шасцю спіцамі[7]. Гэты Перуноў знак і сёння можна ўбачыць у многіх беларускіх вёсках – ён размяшчаецца на сценах хат і пабудоў. Гэта выява, па павер'і, абараняе жыллё і пабудовы разам з іхнімі насельнікамі ад гневу Перуна – удару маланкай. Выява Перуновага знака на шчытах і латах або кальчузе воіна таксама павінна была захаваць іх уладальніка ад гневу Перуна – ад удару ворага на полі бітвы.

Задоўга да прыняцця хрысціянства нашым продкам была вядома і выява крыжа, ці чатырохпрамянёвай зоркі, прычым касы, ці «андрэеўскі», крыж таксама з'яўляўся знакам-абярэгам воіна. Гэты сімвал абароны і ачышчэння азначаў ачышчальнае ахвярнае славянскае вогнішча, малітву, што злучае чалавека з богам[8].

Прамы ж крыж, ці чатырохпрамянёвая зорка, – гэта сімвал росквіту і стварэння, сімвал усёабдымнай сілы Бога. Разыходзячыся ва ўсе бакі свету, яна ўяўляе сабой сімвал квітнеючага Сусвету[9].

Не менш за Дажбога шанавалі нашы продкі і бога Ярылу. Па іх уяўленнях, Ярыла – гэта сын Дажбога, юнак, які верхам на белым кані аб'язджае зямлю. Ён апрануты ў белую кашулю, басаногі, у руках трымае жытнія каласы, на галаве – вянок з палявых кветак. Па слову маці сваёй, жонкі Дажбога, багіні Лады, Ярыла адчыняе вароты нябёсаў і з'язджае з неба на зямлю – у гэты час пачынаецца вясна[10].

[1] Живописная Россия. СПб, 1888. Т. 3. С. 236.

[2] Тамсама. С. 263.

[3] *Яблоков А. О.* Древнерусские геральдические эмблемы // Гербовед. 1992. № 1. С. 45.

[4] Живописная Россия. Т. 3. С. 236.

[5] Тамсама. С. 267.

[6] *Яблоков А. О.* Древнерусские геральдические эмблемы. С. 46.

[7] Тамсама. С. 47.

[8] Тамсама.

[9] Тамсама.

[10] Живописная Россия. Т. 3. С. 267.

Прыняцце хрысціянства славянамі Полацкай Русі было больш доўгім па часе і больш мірным па спосабе, чым гэта было ў Русі Кіеўскай, дзе «Пуцята хрысціў мячом, а Дабрыня – агнём», таму ў свядомасці беларусаў хрысціянства да сённяшняга дня мірна ўжываецца з паганскімі вераваннямі і звычаямі. У нямалай ступені гэтаму спрыяла і сама царква, служыцелі якой, стараючыся вынішчыць у паствы паганскія вераванні і абрады, прызначалі дні хрысціянскіх святаў на дні паганскіх, а хрысціянскіх святых «прызначалі» замест паганскіх багоў быць нябеснымі патронамі спраў зямных. У выніку гэтага ўладаром маланкі і грому стаў святы Ілля[1], ён жа стаў заступнікам падарожнікаў і воінаў. Грамавы знак Перуна (шасціпрамянёвая зорка, ці кола з шасцю спіцамі) пад уплывам хрысціянства пераўтварыўся ў шасціканцовы роўны крыж (іншая назва – падвоены крыж), які таксама лічыўся знакам-абярэгам воіна на полі бітвы. Як і маланка на небасхіле, выява гэтага шасціканцовага крыжа – срэбная (белая) ці, радзей, залатая (жоўтая) на блакітным ці цёмна-блакітным полі. Гэты крыж мае падабенства са старажытным каталіцкім крыжам «Свечыц» (у яго пашыраюцца канцы), а таксама з праваслаўным патрыяршым крыжам і крыжам Святой Еўфрасінні Полацкай (іх верхняя перакладзіна карацей за ніжнюю). Дарэчы, патрыяршыя крыжы прысутнічаюць у дзяржаўных гербах Венгрыі, Славакіі, Літвы і некаторых іншых краін.

У еўрапейскай геральдыцы існуе некалькі назваў падвойнага крыжа: «патрыяршы», «ларанскі», «венгерскі», «архіепіскапскі», «бенедыктынцаў», а таксама «крыж Кірылы і Мяфодзія». Але ўсе гэтыя назвы адпавядаюць толькі асобным перыядам гісторыі, а назва «патрыяршы крыж» сведчыць, што крыж такой формы выкарыстоўваецца ў якасці знака адрознення патрыярхаў царквы.

Калі гэты крыж быў абраны архіепіскапамі царквы ў якасці знака сана – невядома, але ў еўрапейскай геральдыцы падвойны крыж вядомы з XV ст. Прыкладна з гэтага часу вядомы і герб Ордэна Бенедыкта: падвойны крыж на трайным пагорку, маючым дэвіз.

У паўднёваславянскіх краінах падвойны крыж таксама вядомы як крыж Святых Кірыла і Мяфодзія і фактычна звязаны з духоўнай асветай славянскіх народаў. Назву ж «ларанскі» падвойны крыж атрымаў у сувязі з тым, што Рэне Анжу, герцаг Ларанскі (з 1431 г.), у 1435 г. стаў каралём Венгрыі, гербам якога быў падвойны крыж.

Несумненна, што падвойны крыж заходніх і паўднёвых славян паходзіць з Візантыі. дзе ён быў вядомы да IX ст. У Візантыі існавала некалькі розных тыпаў выяў крыжа. Шматлікія іконы маюць як выявы простага (лацінскага) крыжа з распятым Хрыстом – Распяцце, так і выявы падвойнага крыжа, які ўваскросшы Хрыстос трымае ў сваёй руцэ. Ад гэтага падвойны крыж стаў сімвалам Уваскрэсення.

З IX ст. заходнеславацкае княства Нітра стала усходняй часткай Вялікамараўскай імперыі. на якую імкнулася распаўсюдзіць свой уплыў Візантыйская імперыя праз распаўсюджанне хрысціянства. Менавіта таму сюды ў 863 г. візантыйскім імператарам Міхаілам III была накіравана місія на чале з манахамі-прапаведнікамі святым Кірылам (Канстанцінам) і яго братам, святым Мяфодзіем. Няма сум-

[1] Живописная Россия. Т. 3. С. 267; Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994. С. 30.

нення, што менавіта браты-асветнікі славян прынеслі ў Славакію выяву падвойнага крыжа і тлумачэнне яго сімволікі.

У наш час у Еўропе падвойны крыж з'яўляецца сімвалам трох выдатных рэлігійных дзеячаў. якія аднесены да ліку святых. Гэта святы Бенедыкт – бацька заходнееўрапейскага манаства і святыя Кірыл і Мяфодзій – асветнікі славянскіх народаў. А чырвоны і срэбны колеры крыжа сімвалізуюць кроў і цела Хрыста.

У X–XI стст. тэрыторыя Славакіі паступова ўвайшла ў склад Венгерскага каралеўства. што ўзнікла замест Вялікамараўскай імперыі. У складзе гэтага каралеўства тэррыторыя Славакіі складала Паўночнае княства. Гэта княства ў розныя часы мела розны палітычны статус, што залежала ад таго, хто быў уладаром княства. Так, князь Бэла (1048–1060), брат караля Эндру I, быў амаль самастойным манархам з уласнымі васаламі, войскам і незалежнай знешняй палітыкай, якая часам была скіравана нават супраць яго брата-караля. Бэла чаканіў і ўласныя манеты, якія мелі большую каштоўнасць. чым манеты караля. На гэтых манетах і змяшчаліся першыя вядомыя ў Славакіі выявы падвойнага крыжа ў выглядзе вертыкальнай лініі, якая перасякае дзве паралельныя гарызантальныя. Такім чынам, ужо ў XI ст. у славакаў падвойны крыж з'яўляўся не толькі рэлігійным сімвалам, але і палітычным – сімвалам дзяржаўнага суверэнітэту.

Як вядома, узнікненне геральдыкі звязана з крыжовымі паходамі. Менавіта для таго. каб адрозніць у клубах пылу на полі бітвы закаваных у латы сваіх воінаў ад варожых. рыцары пачалі наносіць на свае шчыты якія-небудзь простыя выявы. У якасці такога знака адрознення ў 1189 г. венгерскі кароль Бэла III, які збіраўся прыняць удзел у Трэцім крыжовым паходзе. змясціў на свой шчыт выяву падвойнага крыжа –сімвала, быўшага к гэтаму часу ўжо добра вядомым у каралеўстве. Такім чынам, падвойны крыж стаў гербам венгерскага караля. а ў хуткім часе і першым гербам Венгрыі. У сучасным гербе Венгрыі ён змяшчаецца ў левай палове шчыта.

Вялікі князь Вітаўт таксама меў уласны герб з выявай шасціканцовага крыжа (патрыяршы, з канцамі, якія пашыраюцца). Менавіта такі крыж быў змешчаны на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь, прынятым у 1991 г. Але ўсе названыя крыжы адрозніваюцца ад падвоенага тым, што або маюць перакладзіны рознай даўжыні, або гэтыя перакладзіны размяшчаюцца на рознай адлегласці ад вяршыні і падножжа; у падвойным жа крыжы ўсе канцы аднолькавай даўжыні і адлегласць паміж перакладзінамі аднолькавая з канцамі крыжа.

Так, як і Пярун, паступова было выцеснена са свядомасці нашых продкаў і другое паганскае бажаство – Ярыла. Яго «замяніў» святы Георгій Перамоганосец, якога ў нас часцей за ўсё называюць святы Юры[1]. Гэтаму ў немалой ступені паспрыяла як падабенства іх імёнаў (Ярыла = Юры – Гюргі – Георгій), так і супадзенне дня святога Юрыя з Ярылавым днём (6 мая – пачатак вясны, першы выган статка ў поле. «Да Юр'я павінна сена хапіць і ў дурня», – кажа народная прымаўка).

Як сведчаць хрысціянскія крыніцы, святы Юры–Георгій – гэта рэальна існаваўшая асоба. Вядома, што Георгій

[1] Живописная Россия. Т. 3. С. 259.

нарадзіўся ў Кападокіі, служыў у рымскіх легіёнах пры імператару Дыяклетыяне (каля 243–313) і стаў знатным кападакійскім военачальнікам, меў заслужаныя пашану і славу, але адрокся ад тытулаў, знатнасці і багацця, прыняўшы хрысціянства. За выкрыццё паганства і распаўсюджванне хрысціянства Георгій зведаў жорсткія праследы і страшныя катаванні. Вядома, што ў 303 г. ён быў закатаваны насмерць пасля васьмідзённых здзекаў. За свае мукі і мужнасць, непахісную веру ў Збавіцеля Георгій быў кананізаваны. Лепшыя якасці святога Георгія праявіліся ў яго подзвігах, адным з якіх было выратаванне ім царэўны Аі (Ана) ад дракона. Мітрапаліт Макарый у Вялікай Мінеі (XVI ст.) так апісвае гэты подзвіг: «У палесцінскам горадзе Гавале пасяліўся ў возеры вялікі змей, якому жыхары павінны былі аддаваць на з'ядзенне сваіх дзяцей. Калі чарга дайшла і да царскай дачкі, святы Георгій з'явіўся ёй ля возера, дзе яна стаяла, прынесеная ў ахвяру, і загадаў ёй, абвязаўшы драконаву галаву сваім пасам і аброццю каня, завесці яго ў горад. Царэўна выканала загад Перамаганосца, і калі яна прывяла пачвару ў горад, святы Георгій адсек яму галаву мячом і такім чынам звярнуў у хрысціянства ідалапаклоннікаў Гавальскіх». Гэтаму апісанню адпавядаюць выявы подзвіга святога Георгія ў заходнееўрапейскім жывапісе і на праваслаўных іконах, толькі на іконах святы Георгій не з мячом, а з кап'ём.

Царква абрала святога Георгія нябесным апекуном рыцараў – удзельнікаў крыжовых паходаў супраць мусульманаў і паганцаў. Выява святога Георгія ў выглядзе коннага рыцара мае глыбокі сэнс: белы (срэбны) колер вершніка і яго каня сімвалізуе чысціню хрысціянства і вернасць запаветам Хрыста, меч – сродак барацьбы за веру, чырвоны колер – поле, залітае крывёю ворагаў хрысціянства.

Шмат якія знатныя людзі і цэлыя народы лічылі святога Георгія сваім нябесным апекуном і абаронцам. Напрыклад, выява коннага воіна на княжацкіх пячатках і гербах полацкіх і маскоўскіх князёў – сведчанне іх паходжання ад агульных продкаў – кіеўскіх князёў, нябесным заступнікам якіх лічыўся святы Георгій, бо дакладна вядома, што пачынальнікам роду полацкіх князёў Ізяславічаў з'уляецца князь Ізяслаў – сын вялікага князя кіеўскага святога Уладзіміра Хрысціцеля і полацкай князёўны Рагнеды. Дарэчы, на пячатках і манетах князёў выява вершніка сустракаецца даволі часта. У рускай сфрагістыцы пячаткі з выявай вершніка вядомы з першай паловы XIII ст. У гэты час самым распаўсюджаным сюжэтам пячатак была выява двух святых, якія азначалі імя князя і імя яго бацькі. Так, напрыклад, на пячатках князя Мсціслава Мсціславіча (пам. у 1328) – выява вершніка ўправа з дзідай у руцэ і шасціканцовым крыжам над плячом. Да гэтага ж часу адносіцца і пячатка князя Усевалада Юр'евіча з выявай вершніка на яе адваротным баку. А на пячатках Аляксандра Неўскага была выява каранаванага вершніка ўправа, які трымаў у правай руцэ падняты меч. Падобныя выявы мелі на сваіх пячатках Юрый Даўгарукі, Дзмітрый Данскі, Барыс Цверскі, Іван Мажайскі і полацкія князі. Такім чынам, вершнік, узброены мячом або дзідай, – вельмі распаўсюджаная выява на пячатках князёў. Гэта выява потым з'явілася і на рускіх грошах XIV–XVI стст.

Падобныя выявы сустракаюцца і на пячатках польскіх князёў: Мешкі Старога, Конрада Мазавецкага, яго

сыноў Баляслава і Казіміра, Пшамыслава Велікапольскага; чэшскіх каралёў Пшамыслава Отакара і Вацлава II. У наш час падобныя выявы маюць гербы некаторых гарадоў Еўропы, напрыклад Полацка ці Масквы[1]. На тыповасць выявы вершніка ў заходнееўрапейскай сфрагістыцы, нумізматыцы і геральдыцы, асабліва з XIV ст., звяртаюць увагу шматлікія даследчыкі геральдыкі. Напрыклад, М. П. Сотнікаў лічыць, што гэта конная выява святога Георгія, які ў Візантыі лічыўся патронам імператара і яго войска. А геральдыст XIX ст. Б. Кёне лічыў, што такі тып выяў існуе каля 2000 гадоў,– упершыню выява вершніка сустракаецца на дынарыях рымскага сямейства Фантэя, затым на імператарскіх манетах – і азначае, што імператар паражае варожага воіна. З увядзеннем хрысціянства замест воіна з'явілася выява дракона і кампазіцыя стала сімвалізаваць перамогу хрысціян над паганцамі.

Чырвоны крыж святога Георгія на белым полі – нацыянальны сімвал Англіі, белы крыж святога Георгія на блакітным полі – нацыянальны сімвал Грэцыі, а белы крыж Святога Георгія на чырвоным полі – нацыянальны і дзяржаўны сімвал Даніі. Акрамя таго, у Еўропе святы Георгій лічыўся апекуном рыцарства, таму Георгіеўскі крыж як сімвал мужнасці і вайсковай славы беларускага рыцарства з'явіўся ў сярэдневякоўі на гербах гарадоў беларускага памежжа: Гомеля, Крычава, Оршы, Невеля. Дарэчы, ёсць звесткі, што белы сцяг з чырвоным крыжам святога Георгія быў асабістым штандарам вялікага князя Вітаўта. На палатне з выявай Аршанскай бітвы 1514 г. (арыгінал знаходзіцца ў Варшаве, а копія – у Оршы, у зале краязнаўчага музея) над беларускім войскам лунаюць харугвы з выявай святога Георгія, а на дзідах сцяжкі: у белым полі чырвоны Георгіеўскі крыж, вертыкальная паласа якога дзеліць гарызантальную ў прапорцыях 1:2[2]. Вымпелы з такім малюнкам неслі на клоціках мачтаў і флагштоках ваенныя караблі Расійскай імперыі, экіпажы якіх былі ўзнагароджаны георгіеўскімі сцягамі.

На гербах іншых гарадоў і нават краін захавалася іконаграфічная выява святога Георгія-Юрыя. Напрыклад, на Дзяржаўным гербе Грузіі. А на старажытным гербе Вялікага княства Маскоўска-Рускага (цяпер – герб Масквы) у чырвоным полі конны воін у белай (срэбнай) брані забівае дзідай цмока. Як лічаць некаторыя гісторыкі, гэты герб адлюстраваў жаданне, а потым і падзею, якая здзейснілася, – збаўленне рускіх княстваў ад татара-мангольскага ярма[3], тым больш што вершнік павернуты, насуперак правілам геральдыкі, у свой левы бок, што асацыіруецца з Усходам.

Не менш старажытны і не менш вядомы і другі герб з выявай святога Георгія-Юрыя: у чырвоным полі конны воін у срэбнай брані з занесеным для ўдару мячом у правай руцэ. Гэта старажытны герб крывіцкай, а потым і полацкай зямлі і полацкіх князеў Ізяславічаў. Толькі ў адрозненне ад «маскоўскага» або «грузінскага» святога Георгія «полацкі» святы Юрый звернуты ў свой правы бок, што асацыіруецца з Захадам, бо палачанам прыходзілася часцей адбі-

---

[1] Тысячелетие России 862–1862. 1992. С. 238.

[2] Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі. Мінск, 1995. С. 70.

[3] *Лакиер А. Б.* Русская геральдика. С. 63, 178–179.

ваць напады не мангола-татар, а заходнееўрапейскіх рыцараў-крыжакоў[1].

На жаль, няма дакладных звестак аб тым, якія ўзнагароды існавалі ў Вялікім княстве Літоўска-Рускім, але цалкам магчыма, што вышэйшай узнагародай славутаму рыцару – абаронцу Айчыны – быў крыж святога Георгія. Затым Георгіеўскі крыж стаў баявой узнагародай у Расійскай імперыі. Без перабольшання, гэта была самая высокая, ганаровая і пачэсная ўзнагарода для воіна рускай арміі. У свой час поўнымі кавалерамі знака Георгіеўскага ордэна, або Георгіеўскага крыжа, сталі, напрыклад, Г. Жукаў, С. Будзённы і шмат іншых, у тым ліку і нашы землякі-беларусы, многія з якіх сталі выдатнымі палкаводцамі.

Георгіеўская стужка, чорна-аранжавая, колераў дыму і полымя палёў вайны, зараз больш вядома як гвардзейская, а Георгіеўскі крыж – эмблема і ўзнагарода ўнутраных войскаў МУС, толькі чамусьці замест выявы Святога Георгія–Юрыя на медальёне крыжа знаходзіцца выява зубра.

З летапісных крыніц вядома шмат падзей, калі Масква і Полацк былі ворагамі, але вядомы і падзеі, калі Русь Маскоўская і Русь Полацкая разам адбівалі варожыя напады, а над баявымі станамі русічаў лунаглі сцягі і харугвы з выявамі святога Георгія–Юрыя. У якасці прыкладу можна прывесці ўдзел полацкай дружыны ў складзе войска Аляксандра Неўскага (дарэчы, зяця полацкага князя Брачыслава) у Неўскай бітве і ў бітве на Чудскім возеры. Хрэстаматыйным у рускай гісторыі стаў подзвіг нашага земляка Якава Палачаніна. А амаль праз паўтара стагоддзя прывялі свае дружыны на поле Кулікова на дапамогу маскоўскаму князю Дзмітрыю полацкі князь Андрэй Альгердавіч і друцкі князь Глеб[2]. Невядома, колькі ратнікаў-беларусаў прыйшло на поле Кулікова, але вядома, што друцкая дружына, якая знаходзілася ў перадавым палку, загінула амаль уся, ды і ад полацкай амаль нікога не засталося.



Родавы герб
Рурыкавічаў
«Трызуб»

[1] *Тарасаў К.* Памяць пра легенды. Мінск, 1994. С. 64.

[2] Тамсама. С. 66–71.

## 2.2. Дзяржаўныя сімвалы Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага

Менавіта ў сярэдневякоўі, з умацаваннем Полацкага княства і пашырэннем яго межаў, пашыралася і тэрыторыя выкарыстання полацкага герба. У любой краіне таго часу герб яе ўладара станавіўся гербам краіны; так і герб полацкіх Ізяславічаў, дзе б ні княжыў князь з гэтага роду, заўсёды змяшчаўся на пячатцы і на вайсковай харугве княства, з'яўляючыся яго дзяржаўным сімвалам[1].

Такім чынам, прыкладна ў 60-х гг. XIII ст. «полацкі» святы Юрый стаў гербам маладога Навагародскага княства, а з 1313 г. гэты герб быў зацверджаны ў якасці Дзяржаўнага герба Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага. Магчыма, у гэты ж час герб атрымаў кароткую, як баявы покліч, назву-дэвіз «Пагоня!», што адлюстравала сэнс вайсковай справы беларускай дзяржавы: дагнаць і адбіць у захопніка нарабаванае ім дабро і вызваліць захоплены ім палон, але дакументальна назва «Пагоня» ўпершыню зафіксавана толькі ў гербоўніку Б. Папроцкага, выдадзеным у 1584 г.

Пра крывіцка-полацкае паходжанне герба з выявай святога Юрыя – нябеснага абаронцы Белай Русі і заступніка яе воінаў – сведчаць многія гістарычныя крыніцы. Так, у некалькіх старажытных летапісах, напрыклад у Густынскім або ў Прыбаўленні да Іпацеўскага, змешчаны сведчанні, што «...князь Витень нача княжить над Литвою измысли себе герб и всему княству... печать: рыцер збройный на коне з мечом, еже ныне наречут пагоня»[2]. Тут неабходна заўважыць, што слова «ізмыслі» азначае не «прыдумаў» або «выдумаў», а «зрабіў» ці «набыў», гэта слова аднакарэннае з такімі словамі, як «промысел», «прамысловасць» і г. д. У гэтых жа летапісах знаходзяцца і сведчанні таго, што князь Віцень (1293–1316) – гэта прадстаўнік полацкага роду Ізяславічаў, патомак вялікага князя кіеўскага святога Уладзіміра ў IX калене[3]. Гэтыя ж звесткі пацвярджаюць вядомыя расійскія вучоныя-гісторыкі, напрыклад, А. Лакнер[4], А. Кіркор[5], якія карысталіся і іншымі гістарычнымі крыніцамі, многія з якіх, на жаль, не захаваліся да нашага часу. Меў такі герб і князь Нарымунт (1277–1348): «... В гербе муж збройны, на коне белом, в полю червоном, мечь голый, яко бы кого гонячи держал над головою»[6]. Аб тым, што гербам Белай Русі здаўна быў вершнік белы ў чырвоным полі, які трымаў шаблю (меч) перад сабою, гаворыцца і ў гістарычных даследаваннях вялікага расійскага вучонага-гісторыка В. М. Тацішчава: «Древнейшие манускрипты всю сию страну... Белая Русь именуют... И для сею... герб древнейший: всадник в белом платье... а Черной Руси, которой литовские князи похитили, в черном, киевский, или малороссийский, в красных одеждах были... Герб Белыя Руси издревле был всадник белый в красном поли, саблю имеюсчий пред сабою»[1].

---

[1] *Тарасаў К.* Памяць пра легенды. С. 80–81.

[2] Полное собрание русских летописей. М., 1962. Т. 2. С. 346.

[3] Тамсама. Т. 7. С. 165, 263.

[4] *Лакиер А. Б.* Русская геральдика. С. 242–243.

[5] Живописная Россия. Т. 3. С. 293, 394.

[6] Полное собрание русских летописей. Т. 32. С. 32.

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што герб «Пагоня» з’явіўся ў выніку дамоўленасці літоўскіх князёў з рыцарамі Лівонскага ордэна. Так, напрыклад, польскі сярэдневяковы гісторык С. Акольскі лічыў, што герб з выявай срэбнага шасціканцовага крыжа ў чырвоным полі быў падараваны вялікаму князю Міндоўгу магістрам Лівонскага ордэна ад імя Папы Інакенція IV (1243–1254) у знак удзячнасці за саюз з Ордэнам і прыняцце хрысціянства. У сувязі з гэтым, адзначаў Акольскі, Міндоўг абяцаў не ўмешвацца ў дзейнасць Ордэна ў Прусіі і Жамойціі, за што крыжаносцы абяцалі князю сваю вайсковую дапамогу. Некаторыя гісторыкі сцвярджаюць, што князь Нарымонт (1277–1348) атрымаў гэты герб ад магістра Лівонскага ордэна Флядэра, на дочках якога былі жанаты князь і яго брат Даўмонт. Але больш верагодна, што Нарымонт і Даўмонт абралі сабе герб полацкіх князёў яшчэ да жаніцьбы на дочках магістра, а неабходнасць абрання гэтага герба была прадыктавана палітычным разлікам – трэба было паказаць, што Нарымонт і Даўмонт маюць старажытны герб і паходзяць са старажытнага роду, а таму яны лічаць сябе роўнымі, а магчыма, і вышэйшымі за магістра ордэна.

Найбольш падрабязнае апісанне герба «Пагоня» прыведзена ў летапісным спісе пачатку XVII ст. (захоўваецца ў бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу), які з’яўляецца копіяй старажытнага летапісу: «Пишуть наши кройники руские, и Наримунт был першим автором гербу або клейноту великого князства литовского: в гербе муж збройный, на коню белом в полю червоном, мечь голый, яко бы кого гонячи держал над головою, и есть оттоля тот названный погоня»[2].

На працягу наступных некалькіх стагоддзяў уладарамі Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага засталіся полацкія Ізяславічы: брат Віценя – Гедымін (княжыў у 1316–1341 гг.), сын Гедыміна – Альгерд (княжыў у 1345–1377 гг.), яго пляменнік Вітаўт (княжыў у 1392–1430 гг.), яго сын Ягайла-Уладзіслаў (княжыў і быў каралём Польшчы ў 1377–1434 гг.). Дарэчы, вялікі князь Альгерд, трэці сын Гедыміна ад першай жонкі, князёўны Марыі Віцебскай, меў пяць сыноў, якія былі ахрышчаны паводле праваслаўнага абраду: Андрэй (князь Полацкі), Дзмітрый (князь Бранскі), Канстанцін, Уладзімір і Хведар; ад другой жонкі, князёўны Ульяны Цвярской, меў сем сыноў, якія атрымалі паганскія імёны, а затым былі ахрышчаны паводле каталіцкага абраду: Ягайла-Уладзіслаў, Скіргайла-Іван, Карыбут-Дзмітрый, Лінгвен-Сямён, Карыгайла-Казімір, Вігунт-Аляксандр і Свідрыгайла-Баляслаў.

З 1386 г., калі паміж Польшчай і Вялікім княствам была заключана ўнія, «Пагоня» стала часткай агульнадзяржаўнага герба. У 1539 г. Жыгімонт Аўгуст унес у малюнак «Пагоні» некалькі змен: на шлеме вершніка з’явіўся султан з пер’я, а на кані – трохраговай гунька з каймой. Канчатковае юрыдычнае афармленне «Пагоні» было зроблена Статутамі Вялікага княства 1566 і 1588 гг., дзе сказана і аб абавязковым ужыванні выявы герба на пячатках ваяводстваў і паветаў дзяржавы. Пячаткамі з выявай «Пагоні» замацоўваліся ўсе важнейшыя міжнародныя дамовы Вялікага княства з Тэўтонскім ордэнам, Маскоўскім княствам, Швецыяй, Малдавіяй, Свяшчэннай Рымскай імперыяй, гарадамі Ганзы і іншымі дзяржавамі тых часоў.

Цікавыя звесткі паведамляе Ян Длугаш, аўтар хронікі аб Грунвальдскай

---

[1] *Татищев В. Н.* История Российская. М.–Л., 1962. Т. 1. С. 355–356.

[2] Полное собрание русских летописей. Т. 32. С. 32.



«Пагоня» на саркафагу Ягайлы. Кракаў




Герб «Пагоня» на рулі тагачаснай гарматы. Пачатак XV ст.



Найстарэйшая каляровая выява «Пагоні». Кодэкс Бергомера. Пачатак XV ст.



Дукат часоў вялікага князя Жыгімонта Аўгуста. 1562 г.




Ордэн Рэчы Паспалітай з гербам княства Літоўскага




Харугва коннай паўстанцкай брыгады. 1863 г.





Шчыты «аб'яднаных гербаў княстваў беларускіх» (Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага) і «аб'яднаных гербаў княстваў і абласцей Паўночна-Заходняй Расеі» (Вялікае княства Літоўскае, Самагіція, Беластоцкая вобласць). З Вялікага герба Расійскай імперыі 1857 г.



Ротны сцяг Беларускай гусарскай харугвы. 1776–1783 гг.

Галаўны ўбор палкоўніка Беларускага гусарскага палка (злева) і ківер ніжніх чыноў Гарадзенскага лейб-гвардыі гусарскага палка. 1824–1825 гг.




Срэбны медаль Віленскага сельскагаспадарчага таварыства

бітве[1]. Паводле яго хронікі войска Вялікага княства Літоўска-Рускага складалі 40 вайсковых адзінак – харугваў, у складзе якіх былі літоўцы, русіны (усходнія славяне – жыхары Вялікага княства), жмудзіны і татары. Амаль усе харугвы мелі сцягі з падобнымі выявамі «Пагоні», толькі дзесяць з іх мелі сцягі з выявай «Слупоў» – радавога знака Вітаўта, полацкага варыянта кіеўскага «Трызуба». Несумненна, што кожная вайсковая харугва з Вільні, Трокаў, Гародні, Коўна, Ліды, Полацка, Віцебска, Навагародка, Ваўкавыска, Чартарыйска, Лукамля, Меднікаў, Бярэсця, Пінска, Кіева, Старадуба, Дарагічына, Мельніка, Крамянца, Смаленска, Кобрына, Вількаміра, Менска і Заслаўя, Мсціслава, Ноўгарада-Северскага, Магілёва, Оршы, Слуцка, Уладзіміра (Валынскага), Ратны, Нясвіжа, Крэва, Ашмян, Ушполя, якія выставілі сваіх вояў на абарону Радзімы, мелі свае баявыя сцягі – ваяводскія харугвы – чырвонага колеру, дакладней розных адценняў чырвонага. Паводле «Літоўскай метрыкі», сцяг Віленскага ваяводства быў чырвоным, Валынскага – «брунатым», Полацкага – «сікаражым», Новагародскага – «пелістым», Менскага – «гваздзіковым». Але ў кнізе А. Гваньіні, складзенай у 1578 г., усе гэтыя сцягі апісаны як чырвоныя. Жамойцкае староства мела белы сцяг, Віцебскае і Кіеўскае ваяводствы – зялёныя сцягі, але розных адценняў, Берасцейскае і Троцкае – блакітныя, Мсціслаўскае – жоўты або, паводле Гваньіні, аранжавы. Усе сцягі ваяводстваў мелі два рагі і адрозніваліся, акрамя колеру палотнішча, колерам вершніка і каня. Існаваў таксама і Дзяржаўны сцяг – Дзяржаўная харугва Вялікага княства, якая ўяўляла сабой чырвонае прамавугольнае палатно «шасцідзесяці локцяў» з чатырма рагамі: на адным баку палатна была выява Святога Юрыя – Дзяржаўны герб «Пагоня», на другім – выява Дзевы Марыі з дзіцём Ісусам на руках на фоне Сонца. Меў уласны сцяг і найвышэйшы гетман княства: блакітнае палатно з выявай «Пагоні» на адным баку і Святога Станіслава – на другім. Харугвы былі багата расшытыя раслінным арнаментам (у XVI ст.) або жывёльным (у XVII ст.). Усе гэтыя ваяводскія харугвы, а таксама і павятовыя, пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565 г. пачалі вырабляцца цэнтралізавана і мелі на адным баку выяву Дзяржаўнага герба, а на другім – іншую выяву або надпіс.

Дзяржаўны герб «Пагоня» ў розныя перыяды гісторыі меў свае адметныя рысы: на пячатцы Гедыміна вершнік замест мяча трымае наперавес дзіду; на пячатках Ягайлы, якія датуюцца 1388 г., на шчыце вершніка – выява шасціканцовага крыжа з больш доўгай ніжняй перакладзінай; на пячатках Вітаўта на шчыце – выява «Слупоў» Гедымінавічаў. Такім чынам, на шчыце «Пагоні» змяшчаліся асабістыя гербы ўладароў дзяржавы. З часоў Вітаўта «Пагоня» канчаткова стала гербам дзяржавы, а «Слупы» – гербам кіруючай дынастыі. У часы праўлення рода Ягайлавічаў замест «Слупоў» на шчыце «Пагоні» зноў з’явіўся шасціканцовы крыж, а «Слупы» сталі выкарыстоўвацца ў якасці асабістага герба вялікага князя. Такім чынам, герб «Пагоня» фактычна з’яўляўся афіцыйным дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага (Самагіцкага) з канца XIV ст. і да моманту яго скасавання ў канцы XVIII ст.

---

[1] *Dlugosz J.* Banderia Protenorum tudzie ų insignia sen elenodia Regni Polonia. Kraków. 1851. S. 44–46; *Dlugosz J.* Opera omnia. Crakovia. T. 13. S. 39–41.

## 2.3. «Пагоня» ў Расійскай імперыі

Да 1795 г. герб «Пагоня» з'яўляўся Дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўска-Рускага і Жамойцкага. І нават пасля ліквідацыі княства ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай пячаткі з выявай «Пагоні» мелі адміністрацыі і судовыя ўстановы многіх беларускіх гарадоў. А ў памяць аб той дапамозе, што аказалі воіны-палачане войску Дзмітрыя Данскога на Куліковым полі, пасля ўключэння зямель Полацкага княства ў склад Расійскай імперыі, 21 верасня 1781 г. былі дадзены гербы з выявай Святога Юрыя – «Пагоня» – гарадам утворанага замест яго Полацкага намесніцтва: Веліжу, Віцебску, Гарадку, Дзвінску, Дрысе, Люцыну, Невелю, Полацку, Рэжыцы, Себежу і Суражу. Прычым асабліва падкрэслівалася, што выява гэтага герба старажытная, а ў апісаннях гербаў гарадоў падкрэслівалася, што кожны герб – гэта герб полацкі, але мае іншае поле. Самому ж Полацку быў дадзены асаблівы герб: вершнік і конь чорнага колеру[1]. У імператарскім указе адзначалася, што герб гэты дадзены гораду ў памяць аб доблесным удзеле палачан у Кулікоўскай бітве, а чорны колер вершніка і каня – у памяць аб той самастойнасці, якую мела княства Полацкае ў складзе Вялікага княства Літоўска-Рускага і аб яго ролі ў гісторыі ўсходніх славян, бо чорны колер у сярэдневякоўі быў сімвалам свабоды і незалежнасці.

Крыху раней, 16 жніўня 1781 г., падобныя гербы атрымалі гарады Магілёўскага намесніцтва: Магілёў і Чэрыкаў. Такі ж герб 22 студзеня 1796 г. атрымаў Слуцк (Мінскае намесніцтва), 6 красавіка 1845 г. – Вільня і Рэчыца (Мінская губерня), 9 верасня 1852 г. – Лепель (Віцебская губерня), 8 снежня 1856 г. – Віцебская губерня, а 5 ліпеня 1878 г. – Віленская губерня.

Акрамя таго, некалькі выяў «Пагоні» было і на Дзяржаўным гербе Расійскай імперыі, апошні з якіх быў зацверджаны расійскім імператарам 3 лістапада 1882 г. Над мантыяй герба размяшчаліся паўкругам шэсць шчытоў з гербамі старажытных зямель. Адзін з іх – «шчыт злучаных гербаў княстваў і абласцей беларускіх і літоўскіх»: чатырохчасны з аканечнасцю і малым шчытом усярэдзіне. «У гэтым малым чырвоным шчыце герб Вялікага княства Літоўскага: на срэбным кані, засцеленым чырвонай трохраговай, з залатой каймой, гунькай, вершнік срэбны, у латах (pogon), з паднятым мячом і шчытом, на якім васьміканцовы крыж. У першай частцы шчыта герб Беластоцкі: шчыт перасечаны; у верхняй чырвонай частцы – срэбны арол; у ніжняй залатой частцы – блакітны вершнік у латах з паднятым мячом і срэбным шчытом, на якім чырвоны васьміканцовы крыж; конь чорны, засцелены чырвонай, трохраговай, з залатою каймой, гунькай… У трэцяй срэбнай частцы – герб Полацкі: на чорным кані, са срэбнаю і чырвонаю збруяй, чорны вершнік у латах (pogon), з паднятаю шабляй; эфес шаблі залаты, тарч чырвоны, са срэбным васьміканцовым крыжам. У чацвёртай частцы – герб Віцебскі: срэбны вершнік у латах с паднятым мячом і круглым тарчам; сядло на срэбным кані чырвонае, засцеленае трохраговай залатой, з блакітнай шлячкай, гунькай»[1].

[1] Тысячелетие России 862–1862. С. 226.

У цэлым згаданыя гербы адпавядалі малюнку гістарычнай «Пагоні», толькі расійскія геральдысты замянілі незразумелы ім шасціканцовы крыж на васьміканцовы, праваслаўны. Акрамя таго, у другой, залатой частцы шчыта размяшчаўся герб Жмудзі (чорны мядзведзь на задніх лапах, з чырвонымі вачыма і языком), а ў подножжы шчыта размяшчаўся герб Мсціслаўскай зямлі, прыдуманы чыноўнікамі Дэпартамента герольдыі. На гербе Віленскай губерні «у чырвоным шчыце, на срэбным кані, засцеленым чырвонай трохраговай, з залатой шлячкай, гунькай, срэбны вершнік у латах (pogon), з паднятым мячом і са шчытом, на якім васьміканцовы чырвоны крыж – герб Велікого княжества Літовского»[2].

У час паўстання 1863–1864 гг. рэвалюцыйныя маніфесты і загады паўстанцкага ўрада мелі адпаведную пячатку. Так, «Пісьмо да мужыкоў зямлі польскай», напісанае на беларускай мове і падпісанае «Яська-гаспадар з-пад Вільні», мела круглую пячатку з надпісам па колу «Друкарня нацыянальнага ўрада» на польскай мове і каранаваны шчыт у цэнтры. Шчыт гэты трохчасткавы: у першай частцы – арол Польшчы, у другой – «Пагоня» Вялікага княства, у трэцяй, укліненай знізу, – выява Святога Архістратыга Міхаіла – герб Кіеўскага ваяводства. Такім чынам, на гэтай пячатцы – герб новай дзяржавы, якая павінна была ўзнікнуць на тэрыторыі сучасных Польшчы, Беларусі і Украіны.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. многія народы Расійскай імперыі абвясцілі аб сваім праве на самавызначэнне, таму 25–27 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый, які сфарміраваў Беларускі Нацыянальны Камітэт і даручыў яму распрацаваць у кантакце з Часовым урадам пытанні аўтаноміі Беларусі. На пасяджэнні БНК было разгледжана і пытанне аб сімваліцы, бо былі звесткі, што некаторыя мясцовыя Саветы выкарыстоўваюць пячаткі з выявай «Пагоні». Можа, гэта былі пячаткі ўстаноў тых гарадоў, што мелі гарадскі герб «Пагоня», а можа, гэта былі самастойна выраблены пячаткі – на жаль, гэта невядома, але БНК вырашыў ухваліць гэтую ініцыятыву Саветаў і пастанавіў лічыць гістарычны герб Вялікага княства Літоўска-Рускага нацыянальнай беларускай эмблемай. Гэты ж герб стаў Дзяржаўным гербам абвешчанай 25 сакавіка 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі.

Спражка войска ВКЛ.
1-я палова XVIII ст.



[1] Свод законов Российской империи: В 5 кн. / Под ред. и с зам. И. Д. Мордухай-Болтовского. СПб.: Деятель, 1912. Кн. 1. Т. 1. Ч. 1. С. 18–19.

[2] Тысячелетие России 862–1862. С. 229.

## 2.4. Дзяржаўныя гербы БССР

1 студзеня 1919 г. у процівагу БНР бальшавікі аб'явілі аб стварэнні на частцы ўсходніх беларускіх земляў Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. 3 лютага 1919 г. Першы з'езд Саветаў ССРБ прыняў Канстытуцыю Рэспублікі, у трэцім раздзеле якой прыводзілася апісанне герба ССРБ: «Артыкул 31. Герб Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі складаецца з выяў на чырвоным фоне ў промнях сонца залатых сярпа і молата, змешчаных крыж-накрыж ручкамі уніз, акружаных вянцом з каласоў з надпісам: а) "Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусіі!"; б) "Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!"»[1]. Гэты герб капіраваў гербы РСФСР і УССР, адрозніваючыся ад іх толькі надпісамі.

На аснове рашэнняў з'ездаў Саветаў Беларусі ад 4 лютага 1919 г. і Літвы ад 15 лютага 1919 г. на аб'яднаным пасяджэнні Цэнтральных Выканаўчых Камітэтаў Літвы і Беларусі, якое прайшло ў Вільні 27 лютага 1919 г., было прынята рашэнне аб аб'яднанні савецкіх рэспублік Беларусі і Літвы, а 28 лютага Рада Народных Камісараў рэспублікі зацвердзіла яе афіцыйную назву – Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі (ССРЛіБ, або ЛітБел). Тады ж быў распрацаваны праект Канстытуцыі, які ўтрымліваў апісанне праектаў дзяржаўных сімвалаў ССРЛіБ.

Герб складаўся «з выявы на чырвоным фоне ў промнях сонца залатых сярпа і молата, размешчаных крыж-накрыж ручкамі ўніз і абкружаных вянком з каласоў з надпісам на пяці мовах: літоўскай, польскай, яўрэйскай, рускай і беларускай: "Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літвы і Беларусі"»[2].

ЛітБел праіснавала нядоўга. Ужо ў сакавіку 1919 г. пачалося нямецкае наступленне на тэрыторыю Літвы, і да 25 жніўня 1919 г. на ўсёй тэрыторыі Літвы савецкая ўлада была ліквідавана і ўтворана буржуазная рэспубліка. Фактычна ЛітБел перастала існаваць 6 чэрвеня 1920 г., а юрыдычна – 31 ліпеня 1920 г., калі на сумесным пасяджэнні Мінскага губваенрэўкома з партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі Мінскай губерні была прынята «Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусіі». У Дэкларацыі абвяшчалася аб аднаўленні ССРБ на пачатках, устаноўленых 1 студзеня 1919 г.[3] Верагодна, што адначасова быў адноўлены і герб 1919 г.

У канцы лютага 1924 г. Прэзідыум ЦВК БССР аб'явіў конкурс на стварэнне праекта новага герба рэспублікі (у хуткім часе пачалася распрацоўка і праекта новага дзяржаўнага флага). За лепшыя варыянты герба былі ўстаноўлены тры першыя прэміі на агульную суму ў 300 рублёў. Але ў сувязі з тым, што тэрміны конкурсу былі вельмі сціслыя – спачатку толькі да 5 сакавіка, потым былі прадоўжаны да 1 мая – конкурс станоўчых вынікаў не даў. Але некалькі праектаў, дасланых на конкурс, атрымалі іншае ўвасабленне. Так, газета «Советская Белоруссия» ў нумары ад 11 чэрвеня 1924 г. паведаміла

---

[1] История Советской Конституции 1917–1956 гг. М., 1957. С. 190.

[2] Тамсама. С. 234.

[3] Тамсама. С. 236.

аб тым, што Інбелкульту даручана распрацаваць эмблему для Дзяржаўнага флага БССР. 10 снежня 1924 г. СНК БССР на сваім пасяджэнні разгледзеў пытанне аб эмблеме для флага БССР і пастанавіў прыняць адзін з прапанаваных праектаў, на жаль, невядома які, вядома толькі, што замест галінкі сасны было вырашана змясціць галінку дуба. Апісанне праекта гэтай эмблемы нідзе не было надрукавана, бо было вырашана спачатку даведацца аб тым, ці ёсць эмблемы на флагах УССР і рэспублік Закаўказскай федэрацыі. Другі праект герба, аўтар якога – мастак Г. Змудзінскі, быў зацверджаны 25 снежня 1924 г. Прэзідыумам ЦВК БССР у якасці ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР.

22 снежня 1922 г. Першы Усесаюзны з'езд Саветаў прыняў Дэкларацыю і Дагавор аб стварэнні СССР, у склад якога ўвайшла і БССР. Неўзабаве пасля гэтага паўстала неабходнасць стварэння новага Дзяржаўнага герба. Таму ў канцы лютага 1924 г. Сакратарыят ЦВК БССР аб'явіў конкурс на лепшы праект Дзяржаўнага герба рэспублікі. Адпаведна яго ўмовам, герб павінен быў адлюстраваць прыродныя і гаспадарчыя ўмовы і асаблівасці Беларусі і яе непарыўную сувязь з СССР. Па даручэнні Рады Народных Камісараў рэспублікі ў Інбелкульце была створана камісія, у склад якой былі ўключаны вядомыя беларускія вучоныя Я. Дыла, В. Дружчыц, В. Мялешка, М. Шчакаціхін і інш.

22 кастрычніка 1924 г. камісія прыняла асноўныя палажэнні аб гербе: сувязь БССР з СССР адлюстраваць эмблемай «серп і молат»; пяціканцовую зорку і вянок у гербе лічыць неабавязковымі, але дубовую галінку і каласы па магчымасці захаваць; абавязкова павінен быць і геральдычны дэвіз «Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!», які выконваецца на беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай мовах; асноўныя элементы павінны быць размешчаны на полі геральдычнага шчыта; абрэвіятура рэспублікі «БССР» на гербе не патрэбна. На гэтым жа пасяджэнні была абрана падкамісія для распрацоўкі формы герба.

24 лістапада 1926 г. СНК БССР, разгледзеўшы прадстаўленыя праекты герба, адобрыў адзін з іх, але прапанаваў Наркамасветы ў двухтыднёвы тэрмін дапрацаваць праект так, каб на ім былі:

а) акружэнне – жытнёвыя каласы з левага боку, дубовая галінка з правага, а таксама чырвоная стужка з белымі краямі, выкананая ў беларускім стылі, г. зн. бела-чырвона-белая;

б) сярэдзіна герба – серп і молат, промні сонца, пяціканцовая зорка і надпіс «Б.С.С.Р.»;

в) на стужцы, на чырвонай палосцы, на чатырох мовах дэвіз: «Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!»

У другім праекце прапаноўвалася даць чырвоную стужку без белых краёў, жытнёвыя каласы перавіць канюшынай, а да дубовай галінкі дадаць галінкі другіх дрэў, якія растуць у Беларусі.

27 снежня 1926 г. СНК БССР пад старшынствам Я. Адамовіча прызнаў лепшым малюнак герба, выкананы кіраўніком Беларускага мастацкага тэхнікума Віцебска Валянцінам Віктаравічам Волкавым (1881–1964). Праект герба быў прыняты са змяненнямі, якія прапанаваў СНК: размясціць серп так, каб ён не датыкаўся да зоркі; промні сонца зрабіць больш частымі і аднаго колеру з дыскам сонца. Аўтар дапрацаваў праект, і ён быў накіраваны ў ЦВК БССР. Аўтару была выпісана прэмія ў памеры 500 рублёў.

5 лютага 1927 г. Прэзідыум ЦВК пад старшынствам А. Чарвякова разгледзеў прапанаваны варыянт і парэкамендаваў:

а) стужку зрабіць чырвонай, без белых палос;

б) жыта пераплесці канюшынай;

в) фарбы зямнога шара выканаць у адпаведнасці з гербам СССР;

в) дубовую галінку скамбінаваць з хваёвай.

На сумесным пасяджэнні СНК і Прэзідыума ЦВК БССР 9 сакавіка 1927 г. было вырашана перад VIII з'ездам Саветаў БССР абмеркаваць яшчэ раз усе тры праекты:

*першы* – прыняты СНК БССР 27 снежня 1926 г.;

*другі* – той жа са змяненнямі, унесенымі Прэзідыумам ЦВК БССР 5 лютага 1927 г.;

*трэці* – праект з наступнымі змяненнямі: на зямным шары, як і на гербе СССР, паказаць контуры вады; каласы жыта пераплесці канюшынай.

Канчатковым рашэннем па праекту герба стала пастанова, прынятая 30 сакавіка 1927 г. на пасяджэнні СНК БССР: «Прыняць праект Дзяржаўнага герба БССР, які складаецца з выявы на чырвоным фоне ў промнях узыходзячага сонца сярпа і молата, размешчаных крыж-накрыж рукаяткамі ўніз і акружаных вянком, які складаюць злева жытнёвыя каласы, перавітыя канюшынай, і справа – з дубовай галінкі; унізе паміж абедзвюма паловамі вянка знаходзіцца частка зямнога шара з тэрыторыяй Беларускай ССР. Абедзве паловы вянка перавіты чырвонай стужкай, на якой размешчаны надпісы на беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай мовах: дэвіз "Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!" – і ніжэй "Б.С.С.Р.", г. зн. Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка. Наверсе герба змешчана пяціканцовая зорка».

11 красавіка 1927 г. малюнак Дзяржаўнага герба БССР і яго апісанне былі прыняты VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў і ўнесены ў новую рэдакцыю Канстытуцыі. У артыкуле 74 гэтай Канстытуцыі запісана, што герб «…складаецца з малюнка ў промнях узыходзячага сонца сярпа і молата, якія змешчаны крыж-накрыж ручкамі ўніз і абкружаны вянком; гэты вянок складаецца злева (правы геральдычны бок. – *Л. С.*) з жытніх каласоў, пераплеценых канюшынаю, а справа (левы геральдычны бок. – *Л. С.*) з дубовае галінкі і ўнізе паміж абедзвюма палавінкамі вянка знаходзіцца частка зямной кулі (шара. – *Л. С.*). Абедзве палавіны вянка перавіты чырвонаю стужкаю, на якой змешчаны надпіс на беларускай, яўрэйскай (на правых вітках. – *Л. С.*), рускай і польскай мовах (на левых вітках. – *Л. С.*): "Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!" і ніжэй абрэвіятура: "Б.С.С.Р.". Уверсе знаходзіцца пяціканцовая зорка».

Амаль дзесяць гадоў герб заставаўся нязменным, і толькі па Канстытуцыі, прынятай 19 лютага 1937 г. XII з'ездам Саветаў БССР, надпіс «Б.С.С.Р.» стаў расшыфроўвацца як «Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка». 5 красавіка 1937 г. афіцыйная выява герба была зацверджана пастановай Прэзідыума ЦВК БССР. Але на гэтым змены герба не скончыліся. Справа ў тым, што ў 1937 г. у сувязі з падрыхтоўкай да выдання зборніка «Канстытуцыя СССР і Канстытуцыі саюзных рэспублік» пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета СССР была створана спецыяльная камісія, у склад якой увайшлі высокакваліфікаваныя перакладчыкі. Члены камісіі павінны былі праверыць і ўдакладніць надпісы на гербе СССР і іх пераклад на гербах саюзных рэспублік. У час работы камісіі былі не толькі выпраўлены памылкі ў надпісах, але і зроблены заўвагі па кампазіцыі гербаў, змене або дапаўненні таго ці іншага сімвала. У гербе БССР камісія прапаноўвала замяніць канюшыну льном, што ў значнай ступені адлюстроўвала характар эканомікі, а дэвіз пісаць толькі на рускай і беларускай мовах.




Герб БССР (1919), рэканструкцыя



Пячатка Высокагарадзецкага сельскага Савета з выявай герба БССР (1925)




Герб ССРБ (30.03.1927)




Герб БССР (05.04.1937)




Герб БССР (28.07.1938)




Герб БССР  (28.02.1958)



Дзяржаўны герб
Рэспублікі Беларусь
(10.12.1991)




Вялікі і малы Дзяржаўныя гербы Літоўскай Рэспублікі




Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь (з 7.06.1995)

Улічваючы гэтыя заўвагі, Вярхоўны Савет БССР даручыў аўтару герба В. Волкаву перапрацаваць малюнак герба, а таксама замяніць дубовую галінку каласамі жыта, пераплеценымі льном.

26 ліпеня 1938 г. адкрылася Першая сесія Вярхоўнага Савета БССР, якая 28 ліпеня зацвердзіла новы малюнак Дзяржаўнага герба: правую частку вянка, якая складалася з каласоў, параплялі кветкі ружовай канюшыны; у левай частцы замест дубовай галінкі з'явіліся каласы, пераплеценыя сцяблами льну. На гэтай жа сесіі асноўнымі мовамі БССР былі прызнаны беларуская і руская, таму дэвіз на двух вітках правай часткі сталі пісаць на беларускай мове, на двух вітках левай – на рускай.

У жніўні 1938 г. малюнак Дзяржаўнага герба БССР быў зацверджаны (прычым лён на гербе быў намаляваны з каробачкамі). Затым Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 20 лістапада 1938 г. быў удакладнены пераклад дэвіза: слова «злучайцеся» было заменена словам «еднайцеся»; змянілася таксама і групоўка сонечных промняў. 29 лістапада 1938 г. Другая сесія Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіла гэты Указ, і на гербе была зроблена змена дэвіза.

Такім чынам, герб 1938 г. «складаецца з выявы ў промнях узыходячага сонца залатых сярпа і молата, акружаных вянком, які складаецца з каласоў жыта, перавітых канюшынай, і справа з каласоў жыта, перавітых ільном; унізе, паміж абедзвюма паловамі вянка, знаходзіцца частка зямнога шара, абедзве паловы вянка перавітыя чырвонай стужкай, на якой размяшчаюцца надпісы на беларускай і рускай мовах: "Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!" – ніжэй абрэвіятура – "Б.С.С.Р.". У верхняй частцы герба знаходзіцца пяціканцовая зорка».

У час Вялікай Айчыннай вайны нямецкія акупацыйныя ўлады з мэтай прыцягнення на свой бок беларусаў, пацярпелых ад бальшавіцкіх рэпрэсій, дазволілі абмежаванае выкарыстанне беларускай нацыянальнай сімволікі. Але «Пагоня» з выявай рыцара-беларуса, пад знакам якой беларусы секлі немцаў пад Грунвальдам, была для немцаў вельмі непрыемным напамінам, таму ўжо летам 1943 г. Кубэ прапанаваў замяніць беларускі нацыянальны герб «Пагоня» на выяву блакітнай кветкі васілька на бела-чырвона-белым полі. Гэтая прапанова доўга блукала па службовых інстанцыях рэйха, пакуль ў лютым 1944 г. не высветлілася, што выява васілька зацверджана Гітлерам у якасці эмблемы «фольксдойчэ», якія знаходзіліся ў складзе войск «SS».

Пасля заканчэння вайны ў Дзяржаўны герб БССР змены ўносіліся яшчэ не адзін раз. Першая пасляваенная змена, напэўна, адбылася ў 1951 г., калі прымаўся новы Дзяржаўны флаг: лён, які перавіваў каласы жыта, стаў малявацца не з каробачкамі, а з кветкамі. Другая змена адбылася ў адпаведнасці з правіламі арфаграфіі, прынятымі ў 1956 г., – абрэвіятура назвы рэспублікі стала пісацца без кропак. 28 лютага 1958 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прыняў Указ аб змене напісання дэвіза: замест слова «еднайцеся» стала пісацца «яднайцеся». Затым доўгі час герб заставаўся нязменным, толькі ў 1981 г. у малюнак былі ўнесены некаторыя змены: кветкі льну і канюшыны былі крыху павялічаны, каласы жыта сталі больш важкімі і змянілася групоўка сонечных промняў. У такім выглядзе герб праіснаваў да 1991 г.

# 3. СУЧАСНЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ СІМВАЛЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У канцы 80-х гг. ХХ ст. з ростам нацыянальнага руху бела-чырвона-белы флаг адрадзіўся зноў. Упершыню ў гэты час некалькі бела-чырвона-белых флагаў былі падняты прыхільнікамі Беларускага Народнага Фронту 30 кастрычніка 1988 г. у Мінску ў час святкавання Дзядоў, пасля чаго супраць удзельнікаў акцыі былі кінуты падраздзяленні міліцыі. Але ўжо на мітынгу 19 лютага 1989 г., калі на цяперашнюю плошчу Незалежнасці беларускай сталіцы сабралася некалькі тысяч рабочых мінскіх заводаў, над людскім морам трапятала мора бела-чырвона-белых флагаў.

У перыяд паміж 17 і 23 верасня 1989 г. Прэзідыум Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў прыняў пастанову «Аб беларускай нацыянальнай сімволіцы і яе выкарыстанні ў Мінску»[1], згодна з якой усе арганізацыі, дзяржаўныя і грамадскія ўстановы і жыхары атрымалі права адначасова з дзяржаўнымі сімваламі БССР выкарыстоўваць на тэрыторыі Мінска і беларускую нацыянальную сімволіку. Акрамя таго, на пасяджэнні гарсавета выказвалася прапанова падняць над будынкам гарсавета беларускі нацыянальны флаг, але для яе прыняцця не хапіла аднаго голасу.

27 ліпеня 1990 г. Беларуская ССР аб'явіла аб сваім суверэнітэце, а 25 жніўня 1991 г. Беларусь стала незалежнай краінай. Пасля маскоўскіх падзей жніўня 1991 г. у парадак дня вераснёўскай Шостай пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі было ўключана пытанне аб яе дзяржаўнай сімволіцы. Калі аб гэтым стала вядома, то дэпутаты ад апазіцыі, у большасці прыхільнікі Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне», разгарнулі сярод дэпутатаў Вярхоўнага Савета тлумачальна-агітацыйную прапаганду старадаўніх беларускіх нацыянальных сімвалаў: бела-чырвона-белага флага і герба «Пагоня». Па прапанове гэтых жа дэпутатаў мастакі Я. Кулік, М. Купава, А. Марачкін і Ул. Крукоўскі пачалі рыхтаваць выставу пад умоўнай назвай «Герб і сцяг». На гэтую выставу пачалі збіраць экспанаты з усёй рэспублікі: як з дзяржаўных музеяў, так і з прыватных калекцый. Экспанатаў для выставы выявілася вельмі шмат, а да разгляду пытання аб сімволіцы заставалася мала часу, і таму да гэтай працы далучыліся яшчэ Л. Бартлоў, А. Талбузін, І. Марачкін, Ф. Ладуцька, А. Шатэрнік і інш. Экспазіцыя была разгорнута ў вестыбюлі Вярхоўнага Савета, прычым аўтары афармілі яе такім чынам, каб падкрэсліць гістарычныя вытокі «Пагоні» і бела-чырвона-белага флага. Гэтая выстава, а таксама праведзеныя ў канцы 1980-х гг. «круглыя сталы» па нацыянальнай сімволіцы і зварот супрацоўнікаў Інстытута гісторыі АН рэспублікі да дэпутатаў Вярхоўнага Савета зрабілі сваю справу, і 19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет краіны прыняў Закон аб Дзяржаўным флагу Рэспублікі Беларусь, дзе сказана, што ён уяўляе сабой палотнішча, якое складаецца з

[1] Не адменена да цяперашняга часу.



Грунвальдская бітва. Карціна Яна Матэйкі



Беларуска-польскія вайскі
ў часы Аршанскай бітвы.
Фрагмент карціны XVI ст.

Герб Маскоўскага
княства. XV ст.





Такім, магчыма, быў штандарт
вялікага князя Вітаўта



Герб Рэчы Паспалітай. 1548–1586 гг.



Герб Расіі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.



Праект герба РСФСР, які быў адхілены У. Леніным




Першая пячатка РСФСР, адбітак 1918 г.



Пячатка часоў ЛітБела. 1919 г.



Пячатка камісарыята асветы СРРБ. 1919 г.




*1*



*2*



*3*



*4*

Знакі, якія насілі савецкія грамадзяне, вывезеныя ў Германію:
*1* – агульны для ўсіх грамадзян; *2* – для рускіх; *3* – для беларусаў;
*4* – для ўкраінцаў

трох гарызантальна размешчаных каляровых палос роўнай шырыні: верхняй і ніжняй белага, а сярэдняй – чырвонага колеру. Адносіны шырыні флага да яго даўжыні – 1 : 2.

10 снежня 1991 г. пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь было зацверджана Палажэнне аб Дзяржаўным флагу Рэспублікі Беларусь, дзе таксама прыведзена апісанне флага і ўстаноўлены парадак яго выкарыстання.

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў таксама і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь», якім было ўстаноўлена, што «Дзяржаўным гербам Рэспублікі Беларусь з’яўляецца старажытны беларускі герб «Пагоня», які ўяўляе сабой выяву размешчанага на чырвоным фоне конніка белага колеру, скіраванага ў левы бок, з узнятым мячом і шчытом з крыжам». Адначасова паўстала пытанне аб эталоне Дзяржаўнага герба.

4 кастрычніка 1991 г. была сфарміравана спецыяльная камісія пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета для распрацоўкі дзяржаўнай сімволікі, атрыбутыкі і адпаведных ім дакументаў. Старшынёй камісіі быў прызначаны дэпутат Алесь Трусаў, а ў яе склад увайшло больш за 20 чалавек.

Тым мастакам, якія працавалі над выставай, было даручана распрацаваць і эталоны дзяржаўных сімвалаў. Такім чынам, у склад творчай групы ўвайшлі Я. Кулік, М. Купава, Л. Бартлоў, Л. Талбузін і Ул. Крукоўскі. Асноўную працу над гербам выконвалі Кулік і Крукоўскі; Талбузін працаваў над навершшам дрэўка флага, затым рабіў аб’ёмны эталон герба; Купава рабіў выявы дзяржаўных пячатак; Крукоўскі таксама рабіў новы нагрудны знак дэпутата Вярхоўнага Савета. На жаль, з двух існуючых шляхоў (адаптацыя выявы класічнай «Пагоні» або стварэнне новай выявы «Пагоні» – «новатвора» ХХ ст.), рабочая група прыняла другі.

10 снежня 1991 г. пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь былі зацверджаны эталон Дзяржаўнага герба і Палажэнне аб ім. У першым пункце гэтага Палажэння было сказана: «1. Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь «Пагоня» з’яўляецца сімвалам дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, адлюстроўвае гістарычны шлях беларускага народа, шматвяковае існаванне і развіццё яго дзяржаўнасці.

Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь – шчыт чырвонага колеру з выявай «Пагоні» белага (срэбнага) колеру.

Выява «Пагоні» ўяўляе сабой узброенага конніка верхам на кані ў руху. У правай руцэ ён трымае гарызантальна падняты меч, у левай руцэ – шчыт, на белым полі якога шасціканцовы залаты крыж. З левага боку ў конніка похвы мяча, з-пад сядла звісае трохканцовая гунька (папона)».

